II 264.549

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК
КАТЭДРА ЭТНОГРАФІІ

МІКОЛА КАСЬПЯРОВІЧ

# ВОЛАТЫ

ВЫП. I

## ПРЫЧЫНАК ДА ВЫСЬВЯТЛЕНЬНЯ ПЕРАД-ГІСТАРЫЧНАЙ ЭТНОЛЁГІІ БЕЛАРУСІ

З 24 КАРТАМІ І РЭЗЮМЭ НА НЯМЕЦКАЙ І РАСІЙСКАЙ МОВЕ.

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК У МЕНСКУ 1929.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК
КАТЭДРА ЭТНОГРАФІІ

МІКОЛА КАСЬПЯРОВІЧ

# ВОЛАТЫ

ВЫП. I

## ПРЫЧЫНАК ДА ВЫСЬВЯТЛЕНЬНЯ ПЕРАД-ГІСТАРЫЧНАЙ ЭТНОЛЁГІІ БЕЛАРУСІ

З 24 КАРТАМІ І РЭЗЮМЭ НА НЯМЕЦКАЙ І РАСІЙСКАЙ МОВЕ.

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК У МЕНСКУ 1929.

BIBLIOTEKA NARODOWA

II 264.549

Адбітак з другога тому прац Катэдры Этнографіі.

Друкарня Бел. Акад. Навук. Зак. № 433. Галоўлітбел № 865. Тыраж 25 паасобнікаў.

St. ras.

М. І. КАСЬПЯРОВІЧ.

# Волаты.

*(Прычынак да высьвятленьня перадгістарычнай этнолёгіі Беларусі).*

1.

На беларускай тэрыторыі знаходзіцца многа гарадзішч, валоў і кургаНоў. Беларускія, расійскія і польскія дасьледчыкі налічвалі іх дзесяткі тысяч. Сама больш ёсьць, зразумела, кургаНоў. Завуцца яны, нават у наш час, у розных мясцох, а то і ў аднэй мясцовасьці, парознаму. Так, адны называюць іх валатоўкамі, другія—сопкамі, трэція—капцамі, а чацьвертыя—курганамі. Сярод пісьменных людзей у апошні час пад уплывам літаратурнай мовы пераважае назва курган. Але наўрад ці так было крыху раней.

Прынамсі ў розных актах 16 і 17 стагодзьдзяў даволі часта ўжывалася называньне курганоў валатоўкамі: „мху у волотовки" (11.5.1569) [1]); „идучы от Острое могилы назвиском Матшышъское, з волотовкою" (14.3.1591) [2]); „на полях Задунайских, подле волотовок" (28.6.1595) [3]); „за рекою Двиною у Волотовках" (19.6.1623) [4]); „от тое волотовки у другую волотовку" (26.10.1624) [5]); „знову на волотовце у волсе рубежы" (4.6.1627) [9]); „коло каменя великого, против волотовки" (11.6.1627) [7]); „подле волотовок великую и поля Мошенского" (13.1.1628) [8]); „водле того пляцу лежачый подле волотовок" (19.6.1634) [9]); „от копца в березу рубежную между волотовок" (17.10.1697) [10]); „от каменя у волотовку Борисуцкую" (? 1570) [11]) і інш. Весялоўскі [12]) і Вяроўкін [13]) у адпаведных працах таксама прыводзяць шмат прыкладаў з старадаўніх актаў, у якіх курганы называюцца валатоўкамі.

Але і значна пазьней, у 19 і 20 стагодзьдзях, розныя дасьледчыкі адзначалі называньне курганаў на Беларусі валатоўкамі. Адны з іх сьведчылі аб існаваньні гэтай назвы на ўсёй Беларусі, другія—у паасобных краінах яе. Так, Эўст. Тышкевіч у свой час пісаў, што ёсьць асобны від курганоў, які на Беларусі завецца валатоўкамі [14]). Гэтыя весткі сьцьвярджаў і К. Тышкевіч, адзначаючы ў аднэй з сваіх прац, што „курганы вядомы цяпер на мове беларусаў пад назваю валатовак" [15]). Долэнга-Хадакоўскі-ж яшчэ раней паказваў на існаваньне гэтай назвы адно ў паўночна-ўсходняй Беларусі, пішучы, што „каля Віцебску і Полацку сяляне да сяго часу называюць старасьвецкія вялікія магілы валатоўкамі" [16]). У „Tygodnik'у ilustrowany'м" [17]) і ў „Wisl'e" [18]), ёсьць упаміны аб тым, што каля Беразьвеча на землях б. віленскай губ. курганы таксама завуцца валатоўкамі. Весялоўскі значна пазьней сьцьвердзіў весткі Хадакоўскага аб тым, што „на Беларусі ў ваколіцах Полацку і Віцебску вала-

тоўкамі, волаткамі называлі магілы“ [19]), а Вільчынскі дапаўніў іх паведамленьнем аб тым, што і ў лепельскім павеце б. віцебскай губ. мясцовае насяленьне называе курганы валатоўкамі [20]). Семянтоўскі, абмяркоўваючы анкетнае абсьледваньне археолёгічных помнікаў б. віцебскай губ., таксама адзначыў, што на яе тэрыторыі курганы ў адных мясцох называюцца сопкамі, а ў іншых валатоўкамі [21]). А ў працы Сьпіцына аб б. віцебскай губ. ужо ёсьць дакладнае адзначэньне месц б. б. вяліскага, гарадоцкага і полацкага паветаў, дзе курганы называюцца валатоўкамі [22]). Пакроўскі ў сваіх шматлічных працах адзначаў называньне курганоў валатоўкамі ў усходняй частцы б. ковенскай губ. [23]), прыватна ў б. нова-аляксандраўскім павеце [24]) яе і ў б. б. сьвянцянскім [25]), дзісьненскім і вілейскім паветах б. віленскай губ. [26]). Да апошніх можа быць далучаны і б. лідзкі павет тае-ж віленскае губ., дзе, часамі, курганы, згодна вестак Пакроўскага-ж, завуцца валошынамі (валотынамі?), або магіламі волатаў (вяліканаў) і б. слонімскі пав. б. горадзенскай губ., дзе група курганоў у б. кастровіцкай вол. каля р. Бярозы завецца волатавам або волатавым [27]). Спамінаны ўжо Вяроўкін у сваёй працы [28]) пісаў, што ў ваколіцах м. Лукамля б. сянскага пав. б. магілеўскай губ. многа валатовак. Шпілеўскі сьведчыў аб існаваньні гэтай назвы на тэрыторыі б. менскай губ. [29]), а Татур сьцьверджваў, што „ў б. барысаўскім пав., па правым узьбярэжжы верхавін Бярозы яны (курганы. М. К.) завуцца валатоўкамі“ [30]).

Урэшце, Раманаў, падкрэсьліваючы розныя называньні ў яго час курганоў на Беларусі, пісаў, што „на поўначы іх завуць сопкамі, на поўдні—валатоўкамі, на захадзе—капцамі“ [31]). Завітневіч-жа ў б. рэчыцкім павеце над возерам Вышняя рэчка ў урочышчы Дзіві луг знайшоў магільнік, „на якім вызначаецца вялікіх памераў курган пад назваю олатава або волатава магіла, што мела 150 арш. кругом“ [32]).

Такім чынам, ранейшыя дасьледчыкі, апавяшчаючы ў сваіх працах весткі пра найбольш вядомыя ім мясцовасьці, сьцьверджвалі існаваньне называньня курганоў валатоўкамі ў паўночнай, паўднёвай, заходняй, усходняй і цэнтральнай Беларусі, г. зн. па ўсёй Беларусі, як аб гэтым і гаварылі Эўс. Тышкевіч і К. Тышкевіч. Не абмяжоўваючыся гэтым, я праз Катэдру этнографіі Інстытуту беларускай культуры, запытаўся ў шэрагу беларускіх і чужаземных дасьледчыкаў-сучасьнікаў, а таксама ў шэрагу замежных акадэмій аб іх вестках у справе называньня курганоў валатоўкамі. І. А. Сербаў, навуковы сакратар Катэдры этнографіі Інстытуту беларускай культуры і вучоны археолёг, у адказ на запытаньне пісаў, што „наколькі мне вядома, валатоўкамі называюцца старажытныя магілкі, якія маюць прадаўгаватую форму. Такія магілкі мне прыходзілася назіраць у павярхоўі р. Вялікай і па басэйну сярэдняга Сажа, пераважна гомельскай акругі. Мясцовыя сяляне заўсягды называюць іх валатоўкамі ў адзнак ад купалавідных курганоў“ [33]). А. Н. Ляўданскі, навуковы спэцыялісты Катэдры археолёгіі Інстытуту беларускай культуры, паведаміў, што курганы завуць валатоўкамі каля Гнёздава пад Смаленскам і ў смалявіцкім, лагойскім, зембінскім, барысаўскім і заслаўскім раёнах сучаснай менскай акругі [34]). Шавельскі, выдатны мясцовы краязнаўца, адзначыў, што „сярод нэвельскіх курганоў ёсьць курганы-валатоўкі“ [35]). Урэшце Польская акадэмія навук (Кракаў) на запытаньне аб валатоўках адказала, што „зданьнем археолёга Шукевіча займаюць яны абшар ад Бярозы нёманскай і вытокаў Вяльлі па Дняпро і ад Дзьвіны па Прыпяць“ [36]). Апрача таго, неадменны сакратар Інстытуту беларускай культуры і кіраўнік яго Катэдры этнографіі В. Ю. Ластоўскі на аснове вестак, атрыманых у часе сваёй экспэдыцыі 1928 году, сьцьвярджае ўсеагульнае называньне курганоў валатоў-

камі на тэрыторыі паміж Полацкам і Лепелем [37]), ды ў віцебскім краёвым слоўніку слова валатоўка азначае курган [38]).

Працягваючы свае адшуканьні, я ў лютым месяцы 1928 году праверыў картатэку Катэдры археолёгіі Інстытуту беларускай культуры і выявіў, што называюць курганы валатоўкамі ў сучасным сянскім раёне віцебскай акругі і вушацкім раёне полацкай акругі, а таксама ў б. б. бярэзаньскай, бягомльскай, вітуніцкай, красналуцкай і валасевіцкай валасьцёх б. барысаўскага павету і б. краснапольскай воласьці б. калінінскага павету.

Значыць і ўсе новыя весткі сьцьверджвалі называньне кurganоў валатоўкамі па ўсёй Беларусі, апрача яе крайняга захаду. Усё-ж, улічваючы, што да гэтага часу спэцыяльна ніхто яшчэ гэтым пытаньнем не займаўся, што некаторыя абсьледваньні археолёгічных помнікаў, як, напр., анкетны падлік 1873 году, самімі курганамі цікавіліся толькі ў сувязі з падлікам іншых археолёгічных помнікаў [39]), я ўвайшоў з дакладам у Катэдру этнографіі Інстытуту беларускай культуры аб насьпелай патрэбе спэцыяльнага анкетнага абсьледваньня называньня курганоў на Беларусі валатоўкамі. З маімі довадамі Катэдра згадзілася і мой проект анкеты зацьвердзіла [40]). Анкета была разаслана Катэдрай непасрэдна і праз Цэнтральнае бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры найбольш выдатным краязнаўцам пэрсанальна, а таксама мясцовым краязнаўчым організацыям, тэхнікумам і іншым узвышанага тыпу школам, усяго лікам каля дзесяці тысяч паасобнікаў. Апрача таго, анкета была надрукавана ў № 63(590) газэты „Чырвоная зьмена“ ад 10 чэрвеня 1928 году, які вышаў у ліку дванаццаці тысяч паасобнікаў. На анкету, разасланую непасрэдна і зьмешчаную ў памянёнай газэце, было атрымана 1507 адказаў. З прычыны яшчэ даволі нізкага ўзроўню краязнаўчай пісьменнасьці шырокіх мас беларускага насяленьня, пераважная большасьць анкет засталася без адказу, частка мела нявыразныя або няправільныя адказы і г. д., але ўсё-ж агульны лік атрыманых анкет выразна сьцьвердзіў існаваньне ў 1928 годзе па ўсёй Беларускай савецкай соцыялістычнай рэспубліцы, а таксама ў Нэвельшчыне (РСФСР) і ў дзьвінскім павеце (Латвійская рэспубліка), называньне курганоў валатоўкамі. Правільнасьць гэтага была выяўлена мной у часе асабовага аб'езду ўсіх акруг (аршанскай, бабруйскай, віцебскай, гомельскай, магілеўскай, мазырскай, менскай і полацкай)



Картаграма атрыманых адказаў на анкету 1928 г. аб волатах.

БССР на працягу 1927-28 акад. году, а таксама ў часе кароткатэрміновага побыту праездам у Дзьвінск у 1927 годзе.

Паведамленьні на анкету ня толькі адзначалі факт называньня курганаў валатоўкамі, але, разам з тым, паказвалі і на дакладнае месца знаходжаньня валатовак. Называньне курганоў валатоўкамі бытуе ў наступных паселішчах і іх ваколіцах: 1 аршанская акруга: а) дрыбінскі раён: 1) Суслаўка суслаўскага сс.; б) копыскі раён: 2) Копысь, 3) Стрыкілі маслакоўскага сс., 4) Застружжа дубраўскага сс., в) коханаўскі раён: 5) Шапчына коханаўскага сс., 6) Рамашкова вялікамехаўскага сс., 7) Галашова коханаўскага сс.; г) крупскі раён: 8) Красноўка сакаловіцкага сс., 9) 10 Кастрычнік крупскага сс.; д) ляднянскі раён: 10) Мікіціна іскаскага сс., 11) Каршыкова, 12) Дземянкова, 13) Бель, 14) Слатоўшчына, 15) Валяўкі, 16) Масьліна, 17) Батурыўшчына, 18) Хвесеўка бельскага сс., 19) Прогрэс ляднянскага сс., 20) Слабада, 21) Хваёўка; е) расьнянскі раён: 22) Пахар расьнянскага сс., 23) Дзедня дзедняўскага сс.; ж) чарэйскі раён: 24) Асечана заборскага сс., 25) Парнеўка гілянскага сс., 26) Лютыя абчускага сс., 27) Чарэя, 28) Лагі абчускага сс., 29) Лукамль, 30) Жуpавы абчускага сс., 31) Калодніца дубаўскога сс., 32) Стайкі гілянскага сс., 33) Плаўнік гілянскага сс., 34) Канстантынава сіратавіцкага сс.; II. бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 35) Буда лапіцкага сс., б) бабруйскі раён: 36) Амельлянаў мост каменскага сс., 37) Такары сычкоўскага сс., 38) Рукавец старцаўскага сс., 39) Думіншчына падрэцкага сс., 40) Уласавічы любоніцкага сс., 41) Цяса мышкаўскага сс., 42) Выжары баравіцкага сс., 43) Сеяны Хвойнік міхалёўскага сс., в) глускі раён: 44) Гарадок, гарадкоўскага сс., 45) Горнае сіманаўскага сс., 46) Падзамша хвастовіцкага сс.; г) жлобінскі раён: 47) Старая Рудня ст. руднянскага сс.; д) парыцкі раён: 48) Трэмля любаньскага сс.; е) рагачоўскі раён: 49) Ліскі пабалаўскага сс,; ж) слуцкі раён: 50) Дарасіно дарасінскага сс.; з) старобінскі раён: 51) Крывічы чырвонадворскага сс., 52) Мецявічы мецявіцкага сс., 53) Сяльцо мецявіцкага сс., 54) Цёсаў пагосцкага сс., 55) Пагост пагосцкага сс., 56) Галіца зажэвіцкага сс., 57) Зажэвічы зажэвіцкага сс.; і) чырвона-слабодзкі раён: 58) Малышэвічы малышэвіцкага сс.; III. віцебская акруга: а) бешанкавіцкі раён: 59) Сьвіціна чаркаскага сс., 60) Семянцова біклоскага сс., 61) Палькавічы бешанкавіцкага сс., 62) Бешанкавічы, 63) Лапы біклосскага сс., 64) Вяжышча стралішчанскага сс., 65) Сьвярдлы навікоўскага сс., 66) Язеніца чаркаскага сс., 67) Сьвеча сьвечанскага сс., б) віцебскі раён: 68) Паштовішча даўжанскага сс., 69) Хабаты кабішчанскага сс., 70) Віцебск, 71) Ваяводкі рудакоўскага сс., 72) Суднікі II міхалёўскага сс., 73) Замашэньне пліскага сс., 74) Грыбы, 75) Астроўна астровенскага сс., 76) Новы пасёлак астровенскага сс., 77) Клішы астровенскага сс., 78) Навасёлкі, 79) Чухвары рудакоўскага сс., 80) Ліхошына сініцкага сс., в) высачанскі раён: 81) Шаўкунова, 82) Юшкава асінаўскага сс., 83) Шугаёва высачанскага сс., 84) Макараўка церабельскага сс., 85) Слабада высачанскага сс., 86) Заварацьце стара-бабруйскага сс., 87) Цяцюны выдрэйскага сс., 88) М. Выдрэя выдрэйскага сс., 89) Старабабыльле старабабыльскага сс., 90) Жарнасекі крынкаўскага сс., 91) Ардзеж касьціёўскага сс., 92) Града крынкаўскага сс., 93) Буракі высачанскага сс., 94) Зазыбы кабыльніцкага сс., 95) Дзяковіна высачанскага сс., 96) Дабрына высачанскага сс., 97) Ціхаўка кабыльніцкага сс., 98) Сьцепаненкі бабынавіцкага сс., 99) Баранава высачанскага сс., 100) Брадкі высачанскага сс., г) гарадоцкі раён: 101) Лазоўка бяскатаўскага сс., 102) Аляксееўка віраўлянскага сс., 103) Казьяны казьянаўскага сс.; д) лёзьненскі раён: 104) Ляхавік I ўнаўскага сс., 105) Уна ўнаў-

скага сс., 106) Бандары горбаўскага сс., 107) Зубкі лёзьненскага сс., 108) Нізы; е) межынскі раён: 109) Фралова вышадзкога сс., 110) Пліткі вышадзкога сс., 111) Дзерахі гозьбінскага сс., 112) Боркі гозьбінскага сс., 113) Галіны гозьбінскага сс., 114) Чараравуха межанскага сс., 115) Вышадкі вышадзкога сс., 116) Букаціна вышадзкога сс., 117) Паганяліна вышадзкога сс., 118) Мяжа; ж) сянскі раён: 119) Машканы машканскага сс., 120) Машкі пустынскага сс., 121) Берашова хадчанскага сс., з) сіроцінскі раён: 122) Лазоўка мішневіцкага сс., 123) Сьмяжкова дабейскага сс., 124) Хойнішча міжневіцкага сс., 125) Спаскія прыгаўкі спаскага сс., 126) Юрава лаўжанскага сс.; і) сураскі раён: 127) Гунчанкі, 128) Прамышляі краўцоўскага сс., 129) Янавічы, 130) Сураж; к) чашніцкі раён: 131) Ступіна цяпінскага сс., IV. гомельская акруга: а) веткаўскі раён: 132) Вераб'ёўка; б) гомельскі раён: 133) Баршчоўка; в) лоеўскі раён: 134) Ваўкашанка; г) рэчыцкі раён: 135) Ветхінь, 136) Маставая будка на Дняпры 318 клм,; д) уваравіцкі раён: 137) Варашылаў смычкоўскага сс., 138) Чабатовічы, 139) Баці, 140) Першамайскі, 141) Альхоўка, 142) Дуброва, рудня—целяшоўскага сс.; е) чачэрскі раён: 143) Матнявічы, 144) Глыбочыцы; V. магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 145) Студзенка студзянецкага сс., 146) Глухі глускага сс., 147) Давыдавічы чырвонаасавецкага сс., б) журавіцкі раён: 148) Бохань боханьскага сс.; в) кармянскі раён: 149) Куракоўшчына куракоўскага сс., 150) Пятровічы задубскага сс.; г) клімавіцкі раён: 151) Аляксандраўка, 152) Клімавічы, 153) Зімніцы гусарскага сс., 154) Асіньнікі ціманоўскага сс., 155) Паравалошня макавіцкага сс., д) краснапольскі раён: 156) Хвёдараўка кажамякінскага сс., е) крычаўскі раён: 157) Крычаў; ж) лупалаўскі раён: 158) Сідаравічы слабадзкога сс., 159) Акулінцы, 170) Смолка хацкавіцкага сс., 171) Лыкаў слабадзкога сс., 172) Дарэй тараноўскага сс., 173) Машанакі машанацкага сс., 174) Сухары сухараўскага сс.; з) магілеўскі раён: 175) Ямніцкая дача гусьлянскага сс., 176) Княжыца; і) прапойскі раён: 177) Прапойск; к) хоцімскі раён: 178) Вялікая Ліпаўка, 179) Мужычок прасьцінскага сс., 180) Ціхань арлоўскага сс., 181) Хоцімск; л) чавускі раён: 182) Пятухоўка антонаўскага сс.; м) чачэвіцкі раён: 183) Чарнагразь, 184) пас. імя Дзяржынскага грыбавецкага сс., н) чэрыкаўскі раён: 185) Вепрын вепрынскага сс., 186) Лютраўка, 187) Міляцін горкаўскага сс., 188) Каркоўшчыны верамееўскага сс., 189) Касар каменьскага сс., 190) Сялёнка хаўмянскага сс., 191) Горкі горкаўскага сс., 192) Лабанаўка лабанаўскага сс., 193) Наркі; VI. мазырская акруга: а) жыткавіцкі раён: 194) Жыткавічы; б) лельчыцкі раён: 195) Сініцкае поле сініцка-польскага сс.; в) петрыкаўскі раён: 196) Аголіцкая Рудня капцэвіцкага сс., 197) Капцэвічы капцэвіцкага сс., 198) Петрыкаў; VII. менская акруга: а) барысаўскі раён: 199) Барысаў, 200) Казлы зачынскага сс.; б) бягомльскі раён: 201) Брод нядальскага сс., 202) Асавы, 203) Мелькуні вітуніцкага сс., 204) Бабцы бягомльскага сс.; в) вузьдзенскі раён: 205) Тоўсты Лес стальбоўскага сс., 206) Магільна магільнянскага сс., 207) Сыманчыцы вузьдзенскага сс.; г) Грэскі раён: 208) Сунаі пукаўскага сс., д) заслаўскі раён: 209) Шубнікі барздынскага сс., 210) Хралоўшчына слабадзкога сс., 211) Казекава гатавіцкага сс., 212) Казекава гатавіцкага сс.; е) капыльскі раён: 213) Каласоўшчына, 214) Якусоўшчына ст.-капыльскага сс., 215) Жавалкі пацэйкаўскага сс.; ж) лагойскі раён: 216) Рудня лагойскага сс.: з) Плешчаніцкі раён: 217) Васількаўцы прусавіцкага сс., 218) Альхавец плешчаніцкага сс., 219) Замошша ганцаўскага сс.; і) пухавіцкі раён: 220) Хідра балоцкага сс., 221) Балоча балоцкага сс.; к) самахвалавіцкі раён: 222) Вербнікі самахвалавіцкага сс., 223) Самахвалавічы; л) сьмілавіцкі раён: 224) За-

зерка, пярэжырскага сс.; м) халопеніцкі раён: 225) Ліпавец; н) чэрвенскі раён: 226) Градно раваніцкага сс., 227) Баранаўка, хутарскага сс.; VIII. полацкая акруга: а) асьвейскі раён: 228) Давыдава; б) валынецкі раён; 229) Сьвіраўшчына галубоўскага сс.; в) ветрынскі раён: 230) Мушана заскорскага сс., 231) Нача шпакоўскага сс., 232) Загаева шпакоўскага сс., 233) Пашуціна ветрынскага сс., 234) Жаўнеркі ветрынскага сс., 235) Гарэліца бабыніцкага сс., 236) Варонечы варонецкага сс., 237) Зазер'е гарадоцкага сс., 238) Турэц II, 239) Ветрына ветрынскага сс.; г) вульскі раён: 240) ва ўсім вульскім раёне згодна паведамленьня навуковага сакратара Навукова-дасьледчага таварыства краязнаўства пры Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце т. Невядомскага; д) вушацкі раён: 241) ва ўсім раёне—згодна таму-ж паведамленьню, а таксама паведамленьню інструктара Цэнтральнага бюро краязнаўства т. Шашалевіча; е) дрысенскі раён: 242) Рэдкарэва жаўнянскага сс., 243) Малінава каркалецкага сс.; ж) лепельскі раён: 244) Вусавікі варонскага сс., 245) Горкі палянскага сс., 246) Вялікае поле лепельскага сс., 247) Шчураўка ляхавіцкага сс., 248) Альховікі пышнянскага сс., 249) Гушчын Прудок вораньскага сс.; з) полацкі раён: 250) Максімава юравіцкага сс., 251) Дахнеры булаўскага сс., 252) Гарбацёнкі юравіцкага сс., 253) Стрыкялі громаўскага сс., 254) Пошт юравіцкага сс., 255) Скобрыя юравіцкага сс., 256) Калатоўкі II; і) расонскі раён: 257) Межава зьмітраўскага сс., 258) Замошша зьмітраўскага сс., 259) Масткі гарбачэўскага сс.; IX. Латгалія: Дзьвінск (Daugavpils) [41]).

Апрача таго, паведамленьні на анкету засьведчылі, што валатоўкі ёсьць каля наступных паселішч: 1. аршанская акруга: а) амсьціслаўскі раён: 1) у Валатоўскім арэшніку ля в. Бабынавічы татаршынскага сс.; 2) ува ўсім раёне—згодна адказу з Амсьціславу; б) коханаўскі раён: 3) Мяхінічы і Гарбачэва алёнавіцкага сс., 4) „Волга“ (б. маёнтак Забалацьце) пярэвалачнянскага сс.; 5) Галашова коханаўскага сс.; в) ляднянскі раён: 6) Кісялі іскаскага сс., 7) Ліцьвінава, 8) Араговічы, 9) Жабык, 10) Сазонаўка, 11) Ірвяніцы; г) талачынскі раён: 12) Ганчароўка воўкавіцкага сс., д) чарэйскі раён: 13) Лукамль, 14) Хрытанцы, заборскага сс., 15) Забор'е заборскага сс., 16) Калодніца калодніцкага сс., 17) Беляны заборскага сс., 18) Аўсянік 11; бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 19) Старонка, карытнянскага сс., б) бабруйскі раён: 20) ур. Курганьне ля в. Б. Слабады казуліцкага сс.; в) глускі раён: 21) Вецьвін сіманавіцкага сс.; г) парыцкі раён: 22) Млінок ля в. Іванішкавіч, у 95 кв. каля сядзібы Хухалеўшчына крукаўскага лясьніцтва; д) слуцкі раён: 23) Княжая Магіла, дарасінскага сс.; е) старобінскі раён: 24) Сяльцо мяцявіцкага сс., 25) Валаты пагоскага сс.; ж) чырвона-слабодзкі раён: 26) Бялевічы; III. віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 27) Брыцкі халамерскага сс., 28) Будніца хвашнянскага сс., 29) Вобаль асіпоўскага сс.; б) бешанкавіцкі раён: 30) маёнтак Стары Мар'янфельд каля Бешанкавіч, 31) Заграмазьдзіна навікоўскага сс., 32) ля ручча Пабядзінец недалёка ад Дзьвіны за в. Узрэчча; в) віцебскі раён: 33) Хабаты кабішчанскага сс., 34) даўжанскі сс., 35) воз. Круглае сініцкага сс., 36) Доўгае, 37) воз. Дзякуны; 38) в. Швайцарыя, 39) в. Лапіцкія; 40) Замашэньне, 41) Дзеканы, 42) Большалетчанскі Ботсад, 43) Запаліва, 44) Хапышы, 45) Доўга, 46) Жукаўшчына лятчанскага сс., 47) Воз. Кашана, 48) Ваяводкі; г) высачанскі раён: 49) Буракі, 50) Высокае, 51) Выдрэя, 52) Мяркунэ, 53) Маркулоўшчына, 54) Рэчка, 55) Зарудніца, 56) воз. Бабынавіцкае бабынавіцкага сс., 57) Швяды высачанскага сс., 58) Шчытаўкі астапенскага сс., 59) бераг р. Лучыцы; г) гарадоцкі раён: 60) Зюські, 61) Сараўні вайханьскага сс., 62) Лысенкі сялішчанскага сс., 63) Баравыя бяскатаўскага сс.; д) межанскі раён: 64) Вышадзкі

Бор вышадзкога сс., 65) Боркі гозьбянскага сс., 66) Валатоўкі вышадзкога сс., е) сянскі раён: 67) Машчоны машчонскага сс.; ж) сіроцінскі раён: 68) Казлы мішнявіцкага сс.; з) сураскі раён; 69) Тадулінскае возера, 70) Крупадзёры стара-ботанічнага сс., 71) Брыгідполь на беразе Дзьвіны; і) чашніцкі раён: 72) Бр. Слабада, 73. Міцькаўцы в. альшанскага сс.. 74) Закур'е; IV. гомельская акруга: а) рэчыцкі раён; 75) Волатава Магіла ля Казазоеўкі; V. магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 76) валатоўскі курган ля Лудчыц лудчынскага сс.; б) клімавіцкі раён: 77) Клімавічы; в) лупалаўскі раён: 78) Зылі, 79) Машанакі; г) чэрыкаўскі раён: 80) Сячыхі губішчанскага сс., 81) Лабанаўка лабанаўскага сс,; VII. Менская акруга: а) барысаўскі раён: 82) Б. Стахаў, 83) Брусы, 84) Стары Барысаў, 85) Лісіна кармакоўскага сс.; б) бягомльскі раён: 86) Домжарыцы, 87) Атрубкі, 88) Федаркі кадлубішчанскага сс., 89) Навіны бярозкаўскага сс., 90) Мелькуны вітуніцкага сс., 91) Гарбачэўка, 92) Азярцы, 93) зямля Бягомля, 94) Асавы асаўскага сс., 95) Дабруні вітуніцкага сс., 96) Асінавік мсьціскага сс.; в) заслаўскі раён: 97) Прудзішча слабадзкога сс., 98) Саломіравічы, 99) Кіршы заслаўскага сс., 100) Каланіцы гатавіцкага сс., 101) Крыжоўкі ратамскага сс., 102) Гуры заслаўскага сс.; г) капыльскі раён: 103) Кукавічы, 104) Восава бабаўнянскага сс., 105) Сьвідзічы; д) чэрвенскі раён: 106) Майданава Курганьне хутарскага сс.; VIII. полацкая акруга: а) асьвейскі раён: 107) Ільыно задзяжанскага сс., 108) Сухарукава; б) валынецкі раён: 109) паміж вв. Даўгое і Быхі на р. Свалька; в) ветрынскі раён: 110) заскорскі сс. 111) Слабады, 112) Прэльшчына і Вольшчына, 113) заскорскі сс., 114) Слабада, 115) Фантынька начскага сс., 116) Бязьдзедавічы астроўшчынскага сс., 117) Валатоўкі, 118) Шпакоўшчыны, 119) Гомель; г) дрысенскі раён; 120) Кавасі; д) лепельскі раён: 121) Ляхавічы, ляхавіцкага сс., 122) Бароўна, 123) Глініцы, 124) Ворань, 125) Антонаўка, 126) Лепель, 127) Красналучка, 128) Пушча валасовіцкага сс., 129) Казіншчына, 130) Ст. Валасовічы, 131) Каменная рэчка, 132) Пышня, 133) Сяло, 134) Дабрамысьль, 135) Кавалевічы; е) полацкі раён: 136) Красамай, 137) Забалацьце. Згодна паведамленьня т. Шавельскага валатоўкі ёсьць у IX Невельшчыне: 138) дзьве вёскі Валатоўкі за 16 вёрст ад Нэвеля; 139) за 1 вярсту ад Ямянец, 140) за 0,5 вярсты ад б. маёнтку Заврэм'я [41]).




Карта раёнаў, у якіх экспэдыцыяй і анкетай 1928 г. засведчана дакладнае месца знахаджэньня валатовак.

Такім чынам, з усіх гэтых даных сам сабой выцякае вывад, што на тэрыторыі Беларусі побач з іншымі назвамі курганоў існуе называньне іх валатоўкамі. Бясспрэчна гэта ўстаноўлена паводле старога адміністрацыйнага падзелу для нова-аляксандраўскага павету ковенскай губ.; сьвянцянскага, дзісьненскага, вілейскага і лідзкага паветаў віленскай губ.; слонімскага павету горадзенскай губ.; слуцкага, менскага, барысаўскага, ігуменскага бабруйскага, мазырскага і рэчыцкага паветаў менскай губ.; гомельскага, рагачоўскага, быхаўскага, чэрыкаўскага, клімавіцкага, магілеўскага, чавускага, сянскога, аршанскага, горкаўскага і амсьціслаўскага паветаў магілеўскай губ.; смаленскага павету смаленскай губ.; вяліскага, віцебскага, гарадоцкага, себескага, полацкага, лепельскага, дрысенскага, нэвельскага,




Картаграма называньня курганоў валатоўкамі.

дзьвінскага паветаў віцебскай губ. і апочацкага павету пскоўскай губ. Хоць весткі Польскай акадэміі навук (Кракаў) і лічаць, „што граніц іх (валатовак. М. К.) распаўсюджаньня зараз яшчэ ня можна дакладна вызначыць“ [42]), але разам з тым, яны дазваляюць дапусьціць, што ў віленскім і ашмянскім паветах віленскай губ. і ў наваградзкім павеце менскай губ. таксама існуе называньне курганоў валатоўкамі, тым больш, што гэтыя паветы, як відаць з маёй картаграмы называньня курганаў валатоўкамі [43]), знаходзяцца паміж паветамі, у якіх згодна Пакроўскага і сабраных мной вестак такое называньне існуе. Пакуль што докумэнтальна ня выяўлена называньне курганоў валатоўкамі на крайнім захадзе Беларусі, дзе яно, мабыць, і абрываецца, а таксама ў б. б. пінскім павеце менскай губ. і ў красьнінскім і парэцкім паветах смаленскай губ., якія белымі плямамі выглядаюць на картаграме і выклікаюць некаторую магчымасьць існаваньня называньня курганоў валатоўкамі і тамака.

Адначасна мяне цікавіла пытаньне і аб тым, да якіх межаў усьцяжнае называньне курганоў валатоўкамі дасягае. З адказу Польскае акадэміі навук (Кракаў) ня відаць такога існаваньня назвы валатовак у Польшчы [42]). На поўначы, яно, мабыць, абмяжоўваецца б. усходняй ковеншчынай і Латгаліяй. Далей мяжа яго праходзіць, як відаць, недзе ля Лаваці, дзе яго адзначаў Забелін [44]). Навуковы супрацоўнік, спэцыялісты пскоўскага краёвага музэю А. К. Янсон паведаміў, што ў пскоўскай губ. 1919 г. назва валатоўкі яму невядома, але ў прыведзеным ім докумэнце 14 сталецьця, паводле сьпісу 1694 году, спатыкаецца назва валатавішча. Таксама адказаў і выконваючы абвязкі дырэктара разанскага краёвага музэю, спэцыялісты Мансураў, адносна таго, што яму невядома называньне курганоў валатоўкамі ў разанскім краі, і Генко, член чарапавецкага акруговага бюро краязнаўства, што яму невядома гэта назва ў чарапавецкім краі. Спэцыялісты Сьмірноў пісаў, што ў вяземскім павеце смаленскай губ. мясцовае насяленьне не называе курганы валатоўкамі, але адзначыў, што бліжэй к Смаленску, быць можа, магчыма напаткаць гэтае слова. Загадчык вялікалуцкім музэем Пятроў, рослаўскім музэем Сакалоўскі ды Савін з Дарагабужу паведамілі, што мясцовае насяленьне ў вялікалуцкім, рослаўскім і дарагабускім краі курганы валатоўкамі таксама не называе. Загадчык трубчэўскім музэем Паршнякоў адзначыў, што ў трубчэўскім краі і за межамі яго назвы валатоўкі яму ня прыходзілася чуць. Загадчык бранскім музэем С. Дзееў паведаміў, што ў бранскім краі, а спэцыялісты Ткачэўскі, што ў арлоўскай губ. курганы мясцовым насяленьнем не называюцца валатоўкамі. Супрацоўнік валынскага навукова-дасьледчага музэю, спэцыялісты Лявіцкі, адказаў, што называньне курганаў валатоўкамі ў валынскай і карастэньскай акругах таксама не спатыкаецца. Урэшце, вядомы спэцыялісты Сяр. Гамчанка пісаў, што за час шматгадовых археолёгічных адшуканьняў на Украіне яму ня прыходзілася чуць, каб мясцовае насяленьне называла курганы валатоўкамі. Адносна поўдня за межамі вывучаемай мной тэрыторыі ёсьць толькі адзін упамін аб велетавай магіле ў басэйне р. Стубла, прытока Гарыні, ля Дзяткавіч, ды ў адным докумэнце 1574 г. аб велетавай магіле ў басэйне р. Стыру, прытоку Прыпяці, ля Бараціна [45]). Такім чынам мяжа ўсьцяжнага называньня курганоў валатоўкамі на ўсходзе і на поўдні праходзіць, мабыць, мала больш на поўдзень і на ўсход за мяжу, вызначаную на маёй картаграме, прычым у паўднёвай палавіне Беларусі гэтая назва спатыкаецца радзей, а ў паўночнай—бывае нават выключнай.

Пытаньне аб тым, ці называе мясцовае насяленьне валатоўкамі ўсе курганы наогул, ці толькі пэўны тып іх, складае зусім асобную тэму дасьледваньня з галіны тыполёгіі археолёгічных помнікаў. Мне да гэтага часу прыходзілася чуць называньне валатоўкамі самых розных відаў курганаў і, мне здаецца, што ў вясковага насяленьня няма сталай клясыфікацыі іх [46]).

У шмат якіх мясцох, дзе ёсьць валатоўкі, яшчэ да сёнешняга дня захаваліся паданьні аб тым, што ў іх пахаваны волаты, або асілкі ці багатыры. З некаторымі гарадзішчамі на Беларусі зьвязаны паданьні аб тым, што ў іх жылі гэтыя волаты, асілкі, багатыры. Аб такіх паданьнях ня раз паміналася ў навуковай літаратуры. Так, Сьпіцын у паміранай ужо працы аб археолёгічных помніках Віцебшчыны пісаў, што ў стайнаўскай вол. гарадоцкага пав. віцебскай губ. ёсьць тры гарадзішчы, у якіх згодна народнаму паданьню жылі асілкі; ля в. Шнітніцы дубакрайскай вол. таго самага павету, на беразе воз. Задрачча таксама ёсьць гарадзішча, у якім таксама, як народ кажа, жыў багатыр; каля в. Фролава тае самае воласьці—ёсьць Дзявочая Гара—магіла дзяўчыны забітай багатыром; ля в. Ясянаўца далашчанскай вол. себескага пав. тае-ж губэрні—гарадзішча,

у якім жыў багатыр; за 5 вёрст ад колёніі Марцінаўкі сялецкай вол. б. клімавіцкага пав.—гарадок, які згодна народнаму паданьню пабудавалі разбойнікі [47]) і г. д. Семянтоўскі адносна тэй-жа б. віцебскай губ. паведамляў, што ў себескім павеце народ пабудову тамашніх гарадзіш прыпісвае багатыром [48]). „Пахаджэньне гарадкоў народ тлумачыць таксама, як і курганоў—у гарадкох жылі асілкі (быць можа старэйшыны, першыя князі), якія ваявалі паміж сабой каменнымі сякеркамі“ [49]),—адзначаў у сваёй працы Анікіевіч адносна б. сянского пав. б. магілеўскай губ. У працах Пакроўскага ёсьць паведамленьне аб тым, што згодна народнаму паданьню каля в. Краснага Сяла б. росскай вол. б. ваўкавыскага пав. б. горадзенскай губ. пахаваны волаты [50]). Раманаў паведамляў, што малым яшчэ чуў паданьне аб тым, што ў Волатаве (пагост за 20 вёрст ад Гомеля) у старадаўныя часы жылі багатары“ [51]) і г. д.




Карта раёнаў, у якіх экспэдыцыяй і анкетай 1928 г. документальна засьведчана бытаваньне паданьня аб тым, што ў валатоўках пахаваны волаты.

У картатэцы археолёгічных помнікаў Катэдры археолёгіі Беларускай акадэміі навук ёсьць весткі аб тым, што згодна мясцовых народных паданьняў а) каля в. Дубраўкі б. краснапольскай вол. б. калінінскага пав., каля в. Раманькі тае-ж воласьці і каля в. Броўкі, сучаснага сянскога раёну віцебскай акругі—ёсьць магілы багатыроў; б) каля в. Міцькаўшчыны падлускага сельсавету амсьціслаўскага раёну б. калінінскай акругі і каля в. Буды б. шамаўскай вол. таго самага павету ёсьць гарадзішчы, у якіх жылі багатары; в) з мясцовым курганом ля х. Траўнае, б. валасовіцкай вол. б. барысаўскага пав. зьвязана легенда аб Саўцы—багатары; г) у Буславай магіле за 3 вярсты ад Заракітнага сучаснага нараўлянскага раёну мазырскай акругі — пахаваны начальнік вояў; д) каля в. Ясенка б. краснапольскай вол. б. калінінскага пав. ёсьць горка, на якой жыў багатыр Волат, забіты пасьля багатыром Гуркай і пахаваны тут-жа ў доўгім нявысокім насыпе і г. д.

Ня гледзячы на адсутнасьць спэцыяльных пытаньняў наконт гэтага ў маёй анкеце, паведамленьні на яе ўскосна да іншых пытаньняў выявілі, што на тэрыторыі Беларускай савецкай социялістычнай рэспублікі сярод народу існуюць паданьні, што ў валатоўках пахаваны волаты-багатыры-асілкі—нашы продкі [52]). Дакладныя такія паданьні бытуюць у наступных паселішчах і іх ваколіцах: І. аршанская акруга; а) амсьціслаўскі раён: 1) Каробчына, янаўскага сс.; б) кoханаўскі раён: 2) Шапчына коханаў-

скага сс.; 3) „Волга“ (б. маёнтак Забалацьце) пярэвалачнянскага сс. в) чарэйскі раён: 4) Лукамль; II. бабруйская акруга: г) глускі раён: 5) Гарадок гарадкоўскага сс., 6) Горнае 1, сіманаўскага сс.; 7) Падзалешша хваставіцкага сс.; б) жлобінскі раён: 8) Старая Рудня стара-руднянскага сс.; в) слуцкі раён: 9) Дарасіно, дарасінскага сс.; г) старобінскі раён: 10) Мяцявічы мяцявіцкага сс.; II. Пагост пагосцкага сс.; 12) Сяльцо, мяцявіцкага сс. III. віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 13) Будніца хвашнянскага сс.; б) бешанкавіцкі раён: 14) Сьвеча сьвячанскага сс.; в) высачанскі раён: 15) Макараўка церабельскага сс.; г) межанскі раён: 16) Дзерахі гозьбенскага сс.; д) сураскі раён: 17) Прамышляі крацоўскага сс.; IV. гомельская акруга: а) рэчыцкі раён: 18) мастовая будка на Дняпры на 318 клм,. б) уваравіцкі раён: 19) Чабатовічы, 20) Баці, 21) Альхоўка; V. магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 22) Студзенка студзенецкага сс., 23) Глухі глускага сс., 24) Кузькавічы кузькаўскага сс., 25) Клімавічы; б) лупалаўскі раён: 26) Лыкаў слабодзкага сс.; в) магілеўскі раён: 27) Ямніцкая дача гусьлянскага сс.; VII менская акруга: а) барысаўскі раён: 28) Уборак мсьціскага сс., 29) Мелькуні вітуніцкага сс.; VIII. полацкая акруга: а) лепельскі раён: 30) Валасовічы, б) расонскі раён: 31) Масткі гарбачэўскага сс.; 32) Альбрэхтава альбрэхтаўскага сс. [41]).

Такім чынам, нават з няпоўных даных відаць, што паданьні аб волатах (асілках, багатырох) амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі зьвязаны з валатоўкамі, гарадзішчамі і д. т. п. Больш за ўсё сьведчаньняў аб гэтым мы маем з паўночнай, усходняй і цэнтральнай Беларусі і менш з заходняй, дзе яшчэ пакуль што беларусам немагчыма весьці навуковую працу.

З гэтых паданьняў шмат якія гавораць, што гэтыя волаты былі не паасобныя адзінкі, а цэлыя групы народ. Часамі спатыкаюцца паказаньні на тое, што яны—нашы старадаўныя, незапомныя продкі [52]).

Але ня толькі народ мае ўяўленьне аб волатах як народзе ў сувязі з археолёгічнымі помнікамі. Такога погляду трымаюцца і шмат якія даследчыкі. „У Opisan'i powiatu borysowskiego“... адзначана, што называньне курганаў валатоўкамі можа сьведчыць аб старадаўнім народзе волатах [53]). Такога-ж погляду трымаўся Шафарык [54]), Шпілеўскі [55]) і Весялоўскі [56]). Буслаеў лічыў бясспрэчным, што „памяць аб волатах захавалася ў валатках як дзе-ні дзе-на Русі завуцца старажытныя курганы“ [57] ). „Назва гэтая, мабыць, паходзіць ад аднаго з народаў, што там пражывалі“ [58]),—гаварыў і Татур. „Запэўна, гэта адно з рэальных прыўрочваньняў волатаў“ [59],—пісаў Сьпіцын. Такую-ж думку выказваў і Забелін [43]).

Такім чынам, мне здаецца, можа лічыцца даведзеным, што з называньнем курганаў валатоўкамі зьвязана прадстаўленьне аб народзе волатах. Волат-жа зараз азначае ў беларускай мове, як убачым ніжэй, gigas'a. Гэта аснована на агульным для паданьняў шмат якія народаў „пераконаньні, што людзі ў старадаўнія часы былі іншыя, больш дасканалыя, вышэйшыя ростам і мацнейшыя. Гэта былі вялізныя прабацькі і дзяды, ад якіх ідуць дробныя пакаленьні ўнукаў. Гісторыя рана дамешваецца да эпічнага, цудоўнага і баечным вяліканам дае назвы гістарычных народаў. Такім чынам, уласнае імя народу становіцца агульнай назвай вялікана наагул“ [60]),—зусім слушна гаварыў аб гэтым у свой час Буслаеў. Лічачы, што „утварэньне ўласных назваў народу складае адно з найважных пытаньняў у гісторыі мовы, як гэта было паказана Я. Грымам у гісторыі нямецкай мовы і Шафарыкам у славянскіх старажытнасьцях“,—ён сьцьвярджваў, што „гісторыя мовы на гэтым прадмеце супадае з гісторыяй народаў і з найстаражытнымі эпічнымі паданьнямі. Сынэкдаха ўплывае тутака падвойным чынам: першапачаткова, ад агульнай назвы, што характарызуе

старану або народ, паходзіць уласная; а пасьля, наадварот, уласная пераходзіць у агульную. Першае схавана ў вякох дагістарычных; другое пакінула нам свае сьляды ў найстаражытных эпічных паданьнях аб вяліканах“ [61]). Далей Буслаеў давёў гэтыя думкі адносна саміх волатаў: „такім чынам,—пісаў ён,—утварыўся ў мове цэлы шэраг словаў, якія маюць падвойнае значэньне: і як уласнае імя, назва народу, і як агульная назва вялікана наогул. Такавы напрыклад словы: готун, гун, ант, сполін абоісполін, обр і іншыя. Да гэтых старажатных успамінаў, што захаваліся ў



Птолёмэева карта Эўропейскай Сармацыі.

мове і паданьнях, трэба аднесьці краёвыя словы: волат—багатыр (у тульскай падмове) ад імя народу велеты або волаты“ [62]).

Разам з тым, лічыцца амаль агульнапрынятым, што беларускае слова волаты азначала старадаўні народ велеты. Так лічыў Шафарык [63]), Буслаеў [64]), Забелін [65]), Арлоў [66]) і інш., а з імі згаджаліся Весялоўскі [67]), Нідэрле [68]) і шмат іншых. Выдатны фінскі дасьледчык Мікколя ў данай справе высьветліў нават утварэньне слова волат з велет. Ён пісаў на наша запытаньне: „у тое самліваючы волатаў з Οὐέλται Птолёмэя, я дапушчаю, што першапачатковая фонэма была *velt—, якая дае ў расійскай волат, зусім як melk—дало малако“ [69]). Амаль тое самае, зусім незалежна

ад Міколя пісаў нам і проф. Бузук: „Ад вельтаў маглі застаецца на тэрыторыі Беларусі нават магілы; нарэшце, спадчынай самога імя вельты можна лічыць слова волат, якое з матэматычнай правільнасьцю можна выводзіць з праформы *u̯elt-os, падобна таму як з *melko зьяўляецца ўсходня-славянскае moloko“ [70]). Імя велетаў спатыкаецца ў старых гістарычных крыніцах у самых розных формах: Weltae, Weletabi, Wiltai і д. т. п. [71]).

Таксама добра вядома, што велетаў называлі яшчэ і ваўкамі і люцічамі. І гэтыя дзьве апошнія назвы ўжываюцца ў навуковай літаратуры як сынонімы першай. Апрача вышэйпамянёных дасьледчыкаў можна яшчэ назваць Лелевеля [72]), Катлярэўскага [73]), Сапунова [74]) і шмат іншых, якія на основе першакрыніц карысталіся гэтымі назвамі.

А Нідэрле на сваім месцы адзначыў, што многія гісторыкі „у самым названьні „вэльты, „Οὐέλται“, бачылі толькі перакручэньне назвы Літвы, якое паўстала дзякуючы мэтатэзе, перастаноўцы. Так думаў, наколькі я ведаю, ужо Сестранцэвіч-Богуш, так К. Цэўс, у навейшым часе — Г. Пэрвольф“, — сьцьверджваў ён [75]), ды і Бруһнэр таксама [76]). Быць можа гэта цьверджаньне і самае слушнае. Прынамсі, проф. Бузук лічыць магчымым утварэньне з самой назвы велеты назвы люцічы. „Заўважым толькі, што і гэтую форму можна зьвязаць з праформай *u̯elt але з слабой ступеньню гэтага кораня: з *u̯ьlt магло зьявіцца u̯lut—>lut — у якой-небудзь з старых заходня-славянскіх гаворак, якія былі продкамі будучай чэскай мовы, падобна таму, як разьвілася чэск. žlut-y і т. пад.“ [77]) — пісаў ён нам. Ластоўскі лічыў усё гэта ўжо бясспрэчным, даводзячы, што „эпітэт іхняга найменьня: люты, даў пачатак гасударственнаму найменью — Літва, пераходзячы розныя стадыі: люты, лютвік, лютвяк, люцьвяк — ліцьвяк; люты, лютвін-літвін“ на аснове цьверджаньня, што „падобныя пераходы *ю* ў *і* вядомы ў словах: Лютавор — Літавор, Александр — Аліксандра і інш“ [78]). Згаджаючыся з гэтым, трэба адзначыць, разам з тым, што гэтыя люцічы, ліцьвіны, ніколі не азначалі той народ, які зараз называе сябе літоўцамі, а сваю старану Літвой. Нават на карце le Royaume de Pologne Parle Sr Robert de Vaugondy S Geog. ord. du Roi de S. M. Pol. Duc. de Lorr, et de Bar et de Akademie royal de Nancy a Venise Par Trançois Santini rue Ste Sustine pres la dite Eglise Ches M. Remondinii, старана сучасных літоўцаў называлася Duche de Samogitie; уласна-ж Літва ляжала на ўсход і поўдзень ад апошняй і звалася Grand duche de Lithuanie [79]).

Назвы люцічаў і ваўкоў паказаны ў першакрыніцах у самых розных формах: Luticii, Leutici, Ledndizi і д. т. п.; вълцы, вълчки, Wilken і д. т. п., падобна асноўнай іх назьве велеты [80]).

Назва волатаў упяршыню ўспамінаецца Птолёмэем, як ужо гаварылася, у форме Οὐέλται, у пераліку народаў эўропейскай Сармацыі і на карце яе [81]). На апошняй волаты зьмешчаны на паўднёвым узьбярэжжы тагочаснай вэнэдзкай затокі, а ў тэксьце Птолёмэй адначыў, што „узьбярэжжа ўдоўж вэнэдзкай затокі займаюць велеты“ [82]) на ўсход ад Віслы за вэнэдамі. Гэтыя кароткія весткі ня толькі не вызначалі дакладна стараны волатаў у Птолёмэеў час, г. зн. у 2 сталецьці, але на доўга перарваліся.

Толькі ў пачатку 9 сталецьця аб іх пісалі ў розных нямецкіх летапісах. Ад пазьнейшага часу з паловы 9 да канца 11 сталецьця сьведчаньні першакрыніц аб волатах даволі шматлічныя [83]). Усе яны гавораць аб волатах, як аб надзвычайна магутным народзе, называючы іх велетабамі, вільцамі і люцічамі ў розных формах гэтых слоў. Так, Эйнгард пісаў, што ля „паўднёвага берагу жывуць славяне, айсты і розныя іншыя народы, сярод якіх самыя галоўныя велетабы“, якія самы сябе завуць апошнім імем, а франкамі называюцца вільцамі [84]). Адам Брэменскі, гаворачы аб

BIBLIOTEKA NARODOWA

храбрасьці вільцаў, адзначыў, што яны леўтыкамі (люцічамі) яшчэ называюцца. Гэта-ж адзначаў і Гельмальд [85]) і іншыя.

Разам з тым усе яны — і Кароль Альфрэд [86]), Адам Брэменскі [87]) і Гельмальд [88]) і інш. вызначалі краіну волатаў значна заходней, чым Птолёмэй, а ўласна ў Памор'і ў Батавіі, у Брытаніі і галоўным чынам каля Одры. Праўда, географ равенскі ў сваім месцы ўспамінае раку Люту [89]) на ўсход ад Віслы, якая сваёй назвай нагадвае люцічаў, ды географ баварскі гаворыць, што „люцічы маюць 98 гарадоў“ [90]) дзесь пасярод славян рускіх, а Канстантын Парфірагэнэці, гаворачы аб месцапалажэньні „Харавоі блізка да Расіі“, адзначае, што месцапалажэньне „Іаўдзіертым мяжуе з мяйсцовасьцямі, што плацяць дань старонцы Расіі, с Ульцінамі, Драўляўнамі,




Карта з р. Лютай паводле географа равенскага

Ленцэніанамі і рэштай славян“ [91]). Але гэтыя весткі вельмі бедныя і могуць толькі нагадваць аб волатах дзесь каля драўлян, г. зн. недалёка ад птолёмэевых велетаў.

Амаль усе першакрыніцы сьведчаць аб тым, што волаты былі народам славянскага племені. Шафарык на сваім месцы прыводзіць цэлы шэраг цытат з гэтых першакрыніц, ад Эйнгарда да Длугаша [92]), якія навочна паказваюць прыналежнасьць волатаў да славян.

Ня гледзячы на гэта сярод навачасных пісьменьнікаў няма аднаэгоднасьці ў поглядах на этнографічную прыналежнасьць волатаў, а таксама на месца знахаджэньня птолёмэевых велетаў.

Гэта ў значнай меры залежыць ад таго, што Птолёмэй зьмясьціў сваіх волатаў там, дзе як лічыць большасьць спэцыялістых — Шафарык [93]), Нідэрле [94]), Забелін [95]), Сапуноў [96]) і інш., — спрадвеку жылі жмудзіны і латышы. А раз волаты зьмешчаны на месцы апошніх, то вельмі спакусьліва агаласіць іх літоўцамі, латышамі, або, нават, фінамі. Так і прабавалі рабіць шэраг дасьледчыкаў, як напр., Мюленгоф, Росіна, Пэрвольф і інш [97]). З імі згаджаўся і Весялёўскі, лічачы волатаў айстамі. Для гэтага яму прышлося ўтварыць тэорыю, згодна якой імя волатаў — айстаў было перанесена на славянскія народы ля Одры [98]).

Процілеглага погляду трымаецца школа Шафарыка. „Ніводнага з гэтых зданьняў ня лічу я за пэўнае, за праўдзівае, і настойліва прытрымоўваюся тлумачэньня, якое даў Шафарык, а да яго ўжо іншыя“, пісаў Нідэрле [99]). Але разам з тым ён лічыў канечна патрэбным выправіць Птолёмэя і яго карту з тым, каб зьмясьціць Птолёмэевых волатаў заходней на Віcьле. „Я думаю, — казаў ён, — што вельты ўжо тады сядзелі каля ніжняй Віслы і што Птолёмэй дзеля таго толькі пасунуў іх далёка на ўсход, што расьсяленьне вэнэдаў паміж Балтыцкім морам і Карпатамі ён зразумеў конкрэтна і пад рад“ [100]). „Я пераконаны, — сьцьверджваў далей ён, — што птолёмэевы волаты — славянскае племя велеты — люцічы“ [101]). Забелін-жа, не адмаўляючы існаваньня птолёмэевых волатаў каля Нёману [102]), у процівагу думцы Нідэрле аб тым, што волаты ад Віслы распаўсюдзіліся на заход да Орды [103]), лічыць, што гэтыя птолёмэеўскія волаты прышлі сюды з-пад Одры і былі тутака колёністымі [104]).

Але, мне здаецца, што пасьля працы Шафарыка няма патрэбы выпраўляць Птолёмэя і ўтвараць неверагодную тэорыю колёнізаваньня волатамі Нёманшчыны і б. Русі з заходу. Супярэчнасьць існаваньня волатаў на тэрыторыях спрадвеку занятых літоўцамі-жмудзінамі і латышамі Шафарык ухіліў тым, што волаты суседзілі з імі [105]) пасьля заваяваньня волатамі балтыцкага ўзьбярэжжа ля Нёману [106]) і, быць можа, нават у Птолёмэеў час зьяўляліся тамака пануючымі колёністамі, не складаючы большасьці. Заваяваньне-ж адбывалася не з-пад Одры, а з глыбі нёманскага краю. „У часе Птолёмэя мы знаходзім, што славянскія велеты або люцічы выгналі готаў з Бальту“, — кажа Шафарык. „Але гэтыя-ж велеты, — сьцьверджвае ён далей, — былі яшчэ зусім невядомы Плінію і Тацыту, жывучы тады глыбока пасярод краю, званага Вількамір, у сучаснай віленскай губэрніі“ [107]). Наогул троцкі, вількамірскі і віленскі край Шафарык лічыў прарадзімай волатаў, [108]) зусім слушна адзначаючы, што жмудзінскія паселішчы ў гэтых мясцох зьявіліся толькі каля паловы 13 сталецьця [109]). Вось з гэтага краю, як убачым зараз даволі пашыранага на поўдзень і ўсход, і адбываўся колёнізацыйны рух волатаў на заход [110]) і на ўсход [111]). Так, гаворачы пра палабскіх славян, Шафарык лічыў, што яны „наогул кажучы, вышлі з гэтага краю, які пашыраецца ад Одры цераз Віслу да самай Заходняй Дзьвіны і Бярозы“ [112]) з аднага боку і да Прыпяці з яе прытокамі — з другога [113]). Разам з тым ён-жа правільна адзначаў, што з радзімы волатаў выходзілі толькі лішкі насяленьня, ваяўнічыя дружыны і моладзь, а ня ўвесь народ [114]). Таму пазьней на гэтай тэрыторыі ўпаміналася яшчэ назва люцічаў, а таксама некаторыя племянныя назвы волатаў [115]). Адначасна з вызначэньнем краю птолёмэевых волатаў Шафарык падкрэсьліў і бясспрэчнасьць іх прыналежнасьці да славян. „Што велеты былі, па паходжаньні і мове сваёй, славяне, гэта можна давесьці больш, чым трэба, не адно яснымі сьведчаньнямі летапісцаў сярэдніх вякоў, але таксама і разборам асабовых і мясцовых назваў іх, чыста славянскіх“, — констатаваў ён [116]).

Гільфэрдынг таксама лічыў волатаў славянамі [117]). З Шафарыкам-жа згаджаліся і Лелевэль [118]) і Катлярэўскі [119]) і інш., а Буслаеў [120]), Тышкевіч [121]) і г. д. сьцьверджвалі існаваньне птолёмэевых волатаў на тэрыторыі паміж Дзьвіной, Дняпром, Нёмнам і Прыпяцьцю новымі фактамі.

Гістарычных вестак пра волатаў на тэрыторыях паміж Нёманам, Дняпром, Дзьвіной і Прыпяцьцю амаль зусім няма. Гэта тлумачыцца як мірным жыцьцём іх у той час [122]), так і адсутнасьцю ўласнага летапісаньня [123]). Старажытныя пісьменьнікі цікавіліся больш за ўсё войнамі, ды занадта далёка былі ад волатаў для таго, каб дакладна ведаць іх жыцьцё

і пра яго пісаць. Але, чым больш народ волаты множыўся тутака, і, чым больш пашыраўся іх гандаль, — тым больш яны адчувалі патрэбу ў новых землях і выхадзе да мора, і тым больш налічваліся адважных і гатовых пайсьці на новыя месцы, а да таго былі самыя зручныя шляхі да мора—Нёман і Дзьвіна. І вось у апошняй чвэрці (174-182) другога сталецьця сучаснае эры волаты, дзякуючы Птолёмэю, вядомы як насельнікі балтыцкага ўзьбярэжжа, магчыма, ад Дзьвіны да Віслы. Зразумела, як гаварылася вышэй, асноўная маса волатаў заставалася ў сваёй радзіме, але з часам там запанавала новая назва яе як народу. Таму гістарычныя весткі пра яе пад назвай волатаў птолёмэевым часам і абрываюцца.

Узьбярэжныя волаты яшчэ пэўны час вядомы як гандляры з самымі далёкімі краямі [124]). Але хутка гістарычныя весткі пра волатаў сталі зьвязвацца амаль выключна з волатамі, якія былі славуты ля Одры з 5 да 12 сталецьця, у Батавіі, на фрыскім беразе і паміж рукавамі Рэйну — у 6-8 сталецьці і ў Брытані — у 5-6 сталецьці, а таксама ў краі, што зваўся немцамі Вяліда [125]).

Волаты, як гаварылася, занялі Балтыцкае ўзьбярэжжа каля 180-215 г. і ўжо паміж 200-400 г. г. былі сталымі насельнікамі старых вэнэдзкіх славянскіх земляў на правым беразе Одры, а ў пачатку 5 сталецьця пачалі разам з іншымі народамі славянскімі адваёўваць землі за Одрай. І ўрэшце з 8 да 12 сталецьця, заходнія волаты добра вядомы сваім супраціўленьнем хрысьціянству і войнамі як з немцамі, так і з суседнімі славянскімі народамі, аж да поўнага анямечаньня і фізычнага зьнішчэньня іх у канцы 12 — пачатку 13 сталецьця.

Заходнія волаты, займоючы паказаную вялізную тэрыторыю, складаліся з шэрагу пляменьняў. Племя ранаў займала выспу Рану; племя велінцаў ці валінцаў — выспу Волін; племя цераспенянаў жыло каля р. Пены, паміж ёю і морам; племя хіжанаў аба кішанаў каля р. Ракітніцы; племя доленцаў або доленчан—каля возера Долен і ракі Доленцы; племя ратараў займала мясьцовасьць на поўдзен ад р. Пены за Доленіцай; племя укран жыло па р. Укры каля племя рачан; племя стадаран або гавалян сялілася ля р. Гавалы; племя бражан ці брыжан — на беразе Лабы; племя марычан — каля возера Марца; племя плонаў або блонаў — паміж р. р. Плонай, Гавалай, Нутай і Сербітам; племя семчычаў — на р. р. Стрэме і Лабе і племя лексічаў або лякусічаў — паміж Гавалай і Лабай і інш. [126]). Называючы гэтыя пляменьні заходніх волатаў, Шафарык гаварыў, што наогул трудна дакладна вызначыць іх племянны склад [127]). Паказаньні сучасьнікаў пра волатаў і іх пляменьні на заходзе даволі багатыя і шмат якімі новачаснымі пісьменьнікамі, ім разам з іншымі палабскімі славянскімі народамі прысьвечаны спэцыяльныя монографіі: История балтійских славян А. Гильфердинга (Собрание сочинений А. Гильфердинга. Том четвертый, СПБ 1874), Полабскія славяне А. Павинского (СПБ 1871), Древности права балтійских славян А. Котляревского (Прага 1874), Книга о древностях и исторіи поморских славян в XII веке (Сборник отделенія русскаго языка и славесности императ. академии наук т. 39, СПБ 1891) і інш.

2.

Як ужо гаварылася, народ волатаў ня ўвесь высяліўся з тэрыторыі, што паміж Нёманам, Дняпром, Дзьвіной і Прыпяцьцю. Асноўная маса яго засталася тутака, захаваўшы на пэўны час назву люцічаў або лучан і інш. племянныя назвы. Ды і ўльціны Константына Парфірагэнэці каля валынцаў і драўлян нагадваюць велетаў — волатаў [128]). Разам з тым паасобныя пляменьні волатаў маглі выйсьці і пасяліцца ў новых землях ня з усім

сваім народам, а сярод іншых, родных ім, славянскіх народаў: бодрычаў, сербаў і г. д.[129]). А гэта дазваляе знайсьці пасярод заходніх волатаў і інш. тагочасных славянскіх народаў на захадзе пляменьні, назвы якіх былі вядомы і ў старых землях волатаў. Так, крывічы жылі на Дзьвіне і верхавінах Дняпра і сярод заходніх волатаў[130]), а драгавічы[131])—паўднёвей крывічоў аж да Прыпяці і сярод тых-жа заходніх волатаў[132]). Пеняны, што жылі па р. Пене, прытоку Прыпяці, у якім краі ёсьць горад Пенск і вядомая сярод мясцовага насяленьня пенева магіла[133]), далі назву рэчцы Пене сярод заходніх волатаў і зваліся тамака церасьпенянамі[134]). Назва драў-




Картаграма паселішчаў з асноваю волат у назьве [паводле даных даведачнай літаратуры].

лян вядома была і тутака і сярод бодрычаў[135]). Жыцічы насялялі ваколіцы возера Жыт і жупу сярод палабскіх сербаў[136]) і г. д.

Побач з гэтым слова, як відаць, трывалей за рэч, якую яно азначала[137]) і паміж народам і зямлёй якую ён засяляў існуе моцная сувязь[138]), чаму і памяць аб волатах захавалася ў мясцовых народных географічных назвах[139]) і асабовых іменьнях[140]). На такія перажыткі існаваньня волатаў паказвалі ў свой час самыя розныя дасьледчыкі: Шпілеўскі[141]), Забелін,[142]), Татур[143]), Шэпінг[144]), Арлоў[145]) і інш. Праўда, шмат якія з гэтых назваў могуць азначыць агульную аснову ўтварэньня славянскіх назваў або простае перайманьне ці адлюстраваньне пэўных гістарычных фактаў у вуснай народнай творчасьці[146]) і колёнізаваньне, але вялікая колькасьць іх, згрупаваная на пэўнай тэрыторыі можа служыць бясспрэчным довадам[147]). І шмат дасьледчыкаў прыводзілі ў сваіх працах пералік географічных назваў, якія даводзілі існаваньне волатаў на тэрыторыі паміж Дзьвіной, Дняпром, Прыпяцьцю і Нёманам, а таксама ў тых мясцох, куды яны адсюль выходзілі. Гэта рабіў Шафарык[148]), Тышкевіч[149]), Весялоўскі[150]), Шпілеўскі, Забелін і інш.[151]). Але яны, бясспрэчна, ня вычарпалі ўсіх ма-

тар‘ялаў, якія нават пры сучасным стане вывучанасьці цікавых для нас тэрыторый наўрад ці могуць быць вычарпаны.

Назва волатаў падобна назьве валатовак спатыкаецца ў шэрагу старасьвецкіх докумэнтаў 15-18 сталецьця, азначаючы або географічныя об‘екты; р. Волта, Валатоўск і інш., або ўласныя іменьні, прозьвішчы і мянушкі людзей: Волат, Валатоўнік, Волант і інш.[153]), мяняючы часам паасобныя гукі, а часамі — цэлыя часткі слова, быць можа, па віне пісароў.

Але назва волатаў захавалася ня толькі ў старасьвецкіх докумэнтах, але і ў жывых сучасных назвах рэк і паселішчаў. Дзякуючы надзвычайнаму багацьцю гэтых назваў, я выбраў з адпаведнай даведачнай і апісальнай літаратуры[154]) толькі тыя назвы, якія маюць у сабе бясспрэчную аснову волат і нічым значна не адрозьніваюцца ад гэтага слова. Такімі зьяўляюцца: 1) р. Волата каля Магілеву, 2) р. Валатоўка, правы прыток р. Вобалі і 3) р. Волта, што выцякае з воз. Цярэскага і ўпадае ў Дзьвіну ніжэй в. Пуцілаўшчыны б. дзісьненскага пав. б. віленскай губ., а таксама шэраг паселішчаў: I. у б. смаленскай губ. — 4) Волаты б. духаўшчынскага пав., 5) Волаткава б. рослаўскага пав., 6) Валатоўка б. бельскага пав., 7) Волатчанкі, 8) Волаты на перавозе і 9) Волаты б. парэцкага пав., 10) Волаціна гара і 11) Валатоўск б. смаленскага пав.; 11 у б. віцебскай 12) Валатоўкі б. дамінікаўскай вол. был. нэвельскага пав., 13) Валатоўкі б. казьянскай вол. б. гарадоцкага пав.; 14) Валатоўка, б. храпавіцкай вол., 15) Валатоўка, б. лосьвідзкай вол., б. віцебскага пав.; 16) Валатоўка, 17) Валатоўка і 18) Валатоўкі б. вазьнясенскай вол., 19) Валатоўка, б. ефрасіньеўскай вол., 20) Валатоўнае, 21) Валатнёў, 22) Валатоўка і 23) Валатоўка б. струнскай вол., 24) Валатоўка і 25) Валатоўка б. юравіцкай вол., 26) Валатоўкі б. банонскай вол., і 27) Валатоўкі каля Мілінай Рудні на р. Ушач — б. полацкага пав., 28) Волатава, б. мар‘енгаўзэнскай вол. і 29) Валатоўка б. істрскай вол. б. люцінскага пав., 30) Волуцева і 31) Волуцева б. зябкаўскай вол., б. дрысенскага пав.; 32) Валатоўкі і 33) Валатоўкі б. кубліцкай вол. б. лепельскага пав.; III. у б. віленскай губ. — 34) Валатовічы б. эйшыскай вол. і 35) Валаткаўшчызна б. васілішскай вол. б. лідзкага пав.; 36) Валаткаўшчызна б. палянскай вол., б. ашмянскага пав.; 37) Валатоўкі б. язьненскай вол. б. дзісьненскага пав.; IV. у б. ковненской губ. — 38) Валтуны б. жмуйдзецкай вол. б. вількамірскага пав.; 39) Волатканцы б. крокскай вол. б. ковенскага пав.; 40) Волаткішкі б. рэмігольскай вол. б. панявескага пав.; 41) Волаткайце б. кір‘янаўскай вол., і 42) Волатканцы б. скемскай вол. б. шавельскага пав.; V у б. магілеўскай губ. — 43) Волатава б. гомельскай вол. гомельскага пав.; 44) Валатоўская вул. ў Гомелі; VI. у б. горадзенскай губ. 45) Волтава (воўтаво) б. кастравіцкай вол. б. слонімскага пав. і 46) Волатына б. багародзіцкай вол. б. горадзенскага пав.; VII. у б. менскай губ.—47) Волаты б. цараўскай вол. 48) Войлатава, 49) Волатава, 50) Волатава, 51) Волатава, 52) Волатава і 53) Волатава б. старобінскай вол. б. слуцкага пав.; 54) Волатава б. зачыскай вол., 55) Валатоўкі б. красналукскай вол. і 56) Валатоўкі б. валасевіцкай вол. б. барысаўскага пав. Побач з гэтым ёсьць шэраг назваў, якія нагадваюць сабою старую форму — велеты (Велятоўка 1, Велятоўка 2, Велятоўка 3 б. тураўлянскай вол. б. полацкай пав. б. віцебскай губ.; Велетава і Велетава б. ярэміцкай вол. б. наваградзкага пав., Веляціна б. якшыцкай вол. б. ігуменскага пав., Веляцін б. мікуліцкай вол. б. рэчыцкага пав., Веляцічы і Веляцічы б. вяляціцкай вол. б. барысаўскага пав., Веляцічы і Веляцічы б. лемяшэвіцкай вол. і Велута б. лунінскай вол. б. пенскага пав. б. менскай губ. і інш. (пар. велецкая граніца— „Историко юридическіе матаріалы“, вып. 25, ст. 196, 201), а таксама форму

вільціны (Вільцін, Вільпін і Вільцін б. крэйцбурскай вол. б. дзьвінскага пав., Вільцін б. дамапольскай і Вільцаны б. міхалаўскай вол. б. люцынскага пав. б. віцебскай губ.; Вальціны б. друйскай б. дзісьненскага пав. б. віленскай губ.; Вельці б. радзівіліскай вол. б. шавельскага пав. б. ковенскай губ. і інш.), сьцьверджваючы разам дапушчэньне Весялоўскага аб тым, што сьляды старажытных волатаў захаваліся і каля Дзьвіны[155]).

Апрача ўсіх гэтых назваў, паведамленьні на анкету аб волатах выявілі шэраг невядомых у адзначанай літаратуры паселішчаў, а таксама ўрочышчаў і іншых географічных об'ектаў у межах сучаснай Беларускай савецкай соцыялістычнай рэспублікі і па-за межамі яе, а ўласна: I. аршанская акруга: а) амсьціслаўскай раён: 57) Валатоўскі арэшнік ля в. Бабінічы таршчынскага сс.; 58) р. Валатоўка; 59) Волатаў камень ля Амсьціславу; б) багушэўскі раён: 60) Волатаў роў ля Забор'я; в) дрыбінскі раён: 61) ур. Валатуны; г) круглянскі раён: 62) поле Валатоўшчына ля в. Ахімкавіч і каменіцкага сс. і 63) Волатаў камень на ім; д) расьнянскі раён: 64) Волатаў камень ля камуны „Пахар“ расьнянскага сс.; е) талачынскі раён: 65) в. Валатоўка, воўкавіцкага сс.; 66) в. Валацішча, славенскага сс.; ж) чарэйскі раён: 67) ур. Валатоўкі, заборскага сс., 68) гара Валатоўкі каля в. Забор'е, заборскага сс. 69) в. Валатоўкі калодніцкага сс. 7) гара Валатоўка ля в. Антапольля; 71) луг Валатоўкі ля в. Белай Дубровы, сьлідчанскага сс.; II. бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 72) Волатавы грады ля х. Старонка, карытнянскага сс. 73) ур. Волаткі ля в. Убалацьце карытнянскага сс., 74) Волатаў камень ля х. Старонка карытнянскага сс.; б) бабруйскі раён: 75) р. Валатоўшчанка ў асаўскім сс., 76) за клм. 3 ад в. Папоўшчыны, мышкаўскага сс. сенажаць Волаты, 77) ур. Волат каля в. Цялуша, цялускага сс., в) жлобінскі раён: 78) ур. Сасновы Волат ля в. Піравічы; г) клічаўскі раён: 79) балота Волатаў ля в. Закуцьце, наталаўскага сс.; д) парыцкі раён: 80) урочышча Волата ля. с. Дабравольшчыны дабравольскага сс.; е) рагачэўскі раён: 80) лясныя балотцы Валатоўка, 82) Валатоўка і 83) Валатня ля в. Ліскі пабалаўскага сс.; ж) слуцкі раён: 84) в. Валаты; 85) в. Валаточкі цараўскага сс.; з) старобінскі раён: 86) в. Валаты; 87) ур. Волатава ля Задражава мазурскага сс., 88) в. Волаты зажэвіцкага сс., 89) в. Волаты дарасінскага сс., 90) Волат-камень ля Пагоста пагосцкага сс.; III. Віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 91) Валаткі в. хвашнянскага сс.; б) бешанкавіцкі раён: 92) балота Валатоўкі, 93) поле Валатоўка каля в. Лапы біклоскага сс., 94) лес Валатоўскі каля в. Казакі чаркаскага сс.; в) віцебскі раён: 95) Волатавы мост ля Лосьвіды; 96) ур. Валатоўскі ля в. Курыліна, 97) в. Валатоўка войтаўскага сс., 98) ур. Валатоўкі і 99) х. Валатоўкі ля в. Дзякуны, 99) в. Валатоўкі заронаўскага сс.; 100) хутар Валатоўка каля Бальшых Летцаў; г) высачанскі раён: 101) х. Валатоўкі высачанскага сс., 102) Волатаў камень ля Шаўкунова. 103) в. Валатовічы; д) гарадоцкі раён: 104) в. Валатоўкі нова-вайханскага сс., 105) х. Валатоўкі казьянскага сс., 106) в. Валатоўкі мішнеўскага сс., гара Валатоўка ля в. Лагушчанкі маскіліняцкага сс.; 107) балота Валатоўкі ля в. М. Кашо маскалініцкага сс., 108) в. Волаты аляксандраўскага сс.; 109) поле Валатоўкі ля в. Кажамякі кузьмінскага сс., 110) балота Валатоўкі ля в. Рыбакі ново-вайханскага сс.; л) лёзьненскі раён: 111) в. Валуціна; 112) в. Валатоўкі, 113) ур. Волатава ля в. Гладанькі гладаньскага сс., 114) Волатаў камень на ім; е) межанскі раён: 115) в. Валатоўкі каля в. Мяжы; 116) ур. Валатарня, ля Вышадак вышадзкага сс.; 117) ур. Валатоўкі вышадзкага сс.; ж) сянскі раён: 118) ур. Валатоўка ля в. Броўкі; з) сіроцінскі раён: 119) в. Валатоўкі валатоўскага сс., 120) лес Валацьвянскі лаўжанскага сс.; 121) яма Бяздонная Валатыня

лаўжанскага сс., 122) р. Валатоўка лаўжанскага сс.; 123) камень Валатнік ля в. Вараньki лаўжанскага сс., 124) ур. Валатоўкі ля в. Валатоўкі валатоўскага сс.; і) сураскі раён: 125) х. Валатоўкі краўцоўскага сс., 126) ур. Валатоўкі каля Новікаў марчонскага сс.; к) чашніцкі раён: 127) ур. Валатоўкі чашніцкага сс.; IV гомельская акруга: а) веткаўскі раён: 128) х. Волатава; б) гомельскі раён: 129) р. Валатоўка, 130) Волат-Камень ля Добруша; в) лоеўскі раён: 131) ур. Валат ля в. Дзінамеркі; г) рэчыцкі раён: 132) лес Волат; д) уваравіцкі раён: 133) р. Валатоўка, 134) Волатава дарога, 135) сенажаць Волат, 136) х. Валаток; д) хойніцкі раён: 137) ур. Валатоўкі ля в. Вялікі Бор; V магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 138) ур. Славінскі Волат, 139) лес Волат, 140) ур. Валатніковы востраў з 141) Валатніковым дубам лудчыцкага сс; 142) ур. Валатоўка ля Рыжкаўкі грудзінаўскага сс.; б) клімавіцкі раён: 143) Волат камень гразьнявецкага сс.; 144) хутар Валотня; 145) Валатоўскі вір на р. Астрэ хатавіцкага сс.; 146) ур. Валатухіна лаза ля в. Хатунь хатавіцкага сс.; 147) ур. Волаты ля в. Высокаў, красавіцкага сс., в) краснапольскі раён: 148) хут. Валатовічы кажамякінскага сс.; г) лупалаўскі раён: 149) в. Валатковічы; 150) камень Валатун; д) магілеўскі раён: 150) р. Валота, на ёй: 151) Волатавы гай; е) хоцімскі раён: 152) в. Валатоўка; ж) чэрыкаўскі раён: 153) дарога Валот грокаўскага сс., 154) вур. Валатоўкі ля Сячых губіншчанскага сс., 155) камень Волат ля Сячых, губіншчанскага сс., 156) узгорак Воўчы Волат у губіншчанскім сс., 157) Валатунова поле, ля Лабанаўкі лабанаўскага сс.; 158) Волатава балота шароеўскага сс., 159) Валацяны камень ля Шароеўка шароеўскага сс.; VI. мазырскага акруга: а) калінкавіцкі раён: 160) луг Завалатова ля Слабодкі; б) каралінскі раён: 161) ур. Валатоўка ля в. Рэмезы, 162) ур. Волатава ля Івашкавіч; в) лельчыцкі раён: 163) Волатава балота ля в. Зарубскае буйнавіцкага сс., 164) камень Волат лельчыцкага сс.; г) петрыкаўскі раён: 165) ур. Волатава ля Колкавіч, VII. менская акруга: а) барысаўскі раён: 166) в. Волатава, 167) Валатоўскія рэзы, 168) ур. Валатоўкі, 169) Волаткава поле, 170) ур. Валатоўскія; б) бягомльскі раён: 171) ур. Валаткоўшчына кадлубішчанскага сс.; в) грэскі раён: 172) хутар Волатаў; г) заслаўскі раён: 173) в. Валатоўкі бярэзынскага сс., 174) балота Валатоўкі ганусінскага сс., 175) ур. Валаточкі каля в. Гуі; 176) Валаткоўскі лес новадворскай дачы; д) ка-




Картаграма географічных назваў з асноваю волат паводле экспэдыцыі і анкеты 1928 г. [без паказаных у папярэдняй].

пыльскі раён: 177) Волатава палянка евангелівіцкага сс.; е) лагойскі раён: 178) ур. Волатавы Магілы каронскага сс., 179) ур. Валатоўкі ля Моладзі чаркаўскага сс.; ж) пухавіцкі раён: 180) дуб Волат на пашы Ступічныня ля Цешкава турынскага сс.; 181) Камень волат тамсама; з) сьмілавіцкі раён: 182) камень Волат ля в. Зазерка пярэжырскага сс.; і ) халопеніцкі раён: 183) в. Валатоўкі; 184) х. Валатова жортайскага сс.; к) чэрвенскі раён: 184) ур. Валаткоўшчына ля Градно раваніцкага сс.; 186) х. Валадута раваніцкага сс.; VIII. полацкая акруга: а) асьвейскі раён: 187) ур. Валатоўкі ля в. Вількелева, задзежанскага сс.; 188) ур. Валатоўкі ля Вялікага сяла кісялёўскага сс.; 189) ур. Валатоўкі ля Максімава 190) ур. Валатоўкі ля Сямёнава, 191) ур. Валатоўкі ля Задзежжа, 192) ур. Валатоўка ля ўр. Ўзвышша сухарукаўскага сс., 193) ур. Валатоўка ля в. Старасельле, 194) ур. Валатоўкі на мяжы в. в. Фянькі коханаўскага сс. і Бузава дрысенскага р. 195) ур. Валатоўка ля Кахановіч; б) ветрынскі раён: 196) в. Валатоўкі заскорскага сс; 197) глыбь Валатоўка на р. Начы каля в. Углы; 198) р. Валатоўка заскорскага сс.; 199) х. Валатоўкі ветрынскага сс., 200) Камень Волат ля Варонеч варонецкага сс., в) дрысенскі раён: 201) ур. Валатоўкі каркалецкага сс.; 202) лес Валатоўкі каркалецкага сс.; г) лепельскі раён: 203) Камень Волат ля Вялікага Забор'я, 204) х. Валатоўкі пад Красналукамі, 205) поле Валацішча, 206) ур. Валатоўкі весялоўскага сс.; 207). х. Волат весялоўскага сс.; д) полацкі раён: 208) ур. Валатоўскі юравіцкага сс., 209) в. Валатоўскі; 210) лес Валатоўскі, 211) х. Валатоўскі; е) расонскі раён: 212) в. Валатоўкі, 213) ля в. Чарэкаўкі дворыскага сс. у рэчцы камень Волат, 214) тамсама дуб Волат; IX з-за межаў БССР: 215) ур. Валатоўкі прыдруйскай вол. дзьвінскага пав.; 216) камень Волат каля в. Баяршчына панізоўскай вол. смаленскай губ.; 217) в. Волаты панізоўскай вол. смаленскай губ.

Такім чынам супроць 56 геаграфічных назваў з асновай волат зарэгістраваных папярэдняй літаратурай, мною выяўлена 158 новых такіх назваў толькі ў БССР. Як відаць яшчэ больш лік іх можна-б было адшукаць у заходняй Беларусі калі-б можна было правесьці там спэцыяльнае дасьледваньне.

Тыя-ж паведамленьні на анкету аб волатах выявілі, што прозьвішча з асноваю волат—Валатовіч, Валатун, Валатоўскі, Волатман, Волат, Валатавец, Валатыніна, Валатынскі, Валатарскі і інш.[193] ёсьць у наступных паселішчах і іх ваколіцах: 1 аршанская акруга: а) амсьціслаўскі раён: 1) г. Амсьціслаў, 2) в. Быкавічы хлышчаўскага сс.; 3) в. Малы Рой, 4) х. Занькаўшчына паціолтаўскага сс., б) багушэўскі раён: 5) з. Кемена какоўшчыўнскага сс.; в) горацкі раён: 6) Горкі; г) коханоўскі раён: 7) в. Пярэўлачня, 8) з. Падбярэзьзе сіманаўскага сс., 9) в. Межава алёнавіцкага сс.; д) круглянскі раён: 10) в. Рачча, 11) в. Ахімкавічы 1 каменіцкага сс., е) крупскі раён: 12) Красноўка сакаловіцкага сс., 13) в. 10 Кастрычнік крупскага сс.; ж) расьнянскі раён: 14) Камуна „Пахарь" расьнянскага сс.; з) талачынскі раён: 15) в. Славені славенскага сс., 16) м. Талачын, 17) в. Варанцэвічы воўкавіцкага сс., 18) 69 акол. 7 вуч. ст. Талачын; і) чарэйскі раён: 19) х. Асечана заборскага сс.; 11 бабруйская акруга; а) асіпавіцкі раён: 20) х. Старонка карытнянскага сс., 21) в. Малінаўка; б) бабруйскі раён: 22) в. Барбарава, сычкаўскага сс.; 23) в. Канстанцінаўка асаўскога сс., 24) в. Сьцярхі казлоўскага сс.; 25) в. Чарніца сычкоўскага сс., 26) в. Бабоўе асаўскога сс., 27) в. Уласавічы любоніцкага сс., 28) з. Яменск любаньскага сс., 29) в. Брожа брожаскага сс.; в) глускі раён: 30) в. Жукавічы і 31) в. Бярозаўка бярозаўскага сс., 32) з. Зацішша карпілаўскага сс., 33) в. Чыкілі казловіцкага

сс., 34) Прывароцьце, 35) з. Лучкі, 36) з. Бярэжкі, 37) Рудня карпілаўскага сс., 38) Гарадок гарадокскага сс., г) жлобінскі раён: 39) в. Піравічы пірэвіцкага сс., 40) в. Кругавец пірэвіцкага сс., 41) с. Старая Рудня ст.-руднянскага сс.; д) любаньскі раён: 42) м. Любань; е) парыцкі раён: 43) х. Трэмля любаньскага сс., 44) в. Высокі Поўк казлоўсоага сс., 45) в. Тур. Слабада туркаўскага сс.; ж) рагачэўскі раён: 46) в. Гарадзец прыбарскага сс;. 47) в. Асінаўка мяркулавіцкага сс.; з) слуцкі раён: 48) в. Бароўка мялешкавіцкага сс., 49) Серагі сераскага сс., 50) м. Слуцак, 51) в. Лучнікі ля Слуцку, 52) в. Квасьнічы цараўскага сс., 53) в. Малая Сьліўка казловіцкага сс., 54) в. Цараўцы цараўскага сс., 55) в. Панічы дарасінскага сс., 56) х. Крывая Хвоя амговіцкага сс., 57) в. Цёплая Дуброва амговіцкага сс., 58) в. Кляпчаны цараўскага сс., 59) м. Машыцы івань-агародніцкага сс., 60) в. Сьліва казловіцкага сс.; і) старадарoскі раён: 61) Пасека пасецкага сс.; к) старобінскі раён: 62) Круглы востраў старобінскага с., 63) Задражава мазурскага сс., 64) в.Крывічы, 65) Падоблачня старобінскага р., 66) Зажэвічы зажэвіцкага сс., 67) с. Сяльцо мяцявіцкага сс., 68) Быкава пагосцкага сс., 69) Пагост пагосцкага сс., 70) Карысьці пагосцкага сс., 71) Смольлева пагосцкага сс., 72) Цёсаў пагосцкага, 73) в. Волаты пагосцкага сс.; л) чырвона-слабодзкі раён; 74) Чаплічы чапліцкага сс.; 75) Рачкавічы малышэвіцкага сс., 76) Заўшыцы старчыцкага сс., 77) Бялевічы, 78) Малышэвічы малышавіцкага сс.; III. віцебская акруга: а) бешанкавіцкі раён: 79) Бачэйкава бачэйкаўскага сс., 80) Сьвіціна чаркаскага сс., 81) Лапы біклоскага сс.; б) віцебскі раён: 82) в. Путысініцкага сс., 83) Віцебск; в) высачанскі раён: 84) Шаўкунова, г) Гарадоцкі раён: 85) Казьяны казьянскага сс.; д) сянскі раён: 86) Зямковічы алексініцкага сс., 87) Машкі; е) сіроцінскі раён: 88) Лазоўка мішнеўскага сс.; чашніцкі раён: 89) в. Ступіна цяпінскага сс., 90) Жэрына лазукоўскага сс., 91) в. Іканкі дварэцкага сс., 92) Зарэчная Слабада чашніцкага сс.; IV гомельская акруга: а) брагінскі раён: 93) Мікулічы; б) будакашалёўскі раён: 94) Мутнае; в) веткаўскі раён: 95) Вераб'ёўка; г) гомельскі раён: 96) Баршчоўка; д) рэчыцкі раён: 97) Васілевічы, 98) Гарыводы, 99) Холмеч; е) уваравіцкі раён: 100) Варашылаў смычкоўскага сс., 101) Чабатовічы, 102) Альхоўка; ж) хойніцкі раён: 103) Хойнікі, 104) Загальская слабодка, 105) Вялікі Бор, 106) Храпкоў; з) чачэрскі раён: 107) Палесьсе; V. магілеўская акруга: а) клімавіцкі раён: 108) Клімавічы, 109) Востраў




Карта раёнаў, у якіх анкетай і экспэдыцыяй 1928 г. засьведчана бытаваньне прозьвішч з асновай волат.

лазавецкага сс., 110) Аляксандраўка, 111) Зімніцы гусарскага сс.; б) крычаўскі раён: 112) Шаеўка; в) лупалаўскі раён: 113) Смолка хацкавіцкага сс., 114) Сухары лупалаўскага р., 115) Машанакі машанацкага сс.; г) магілеўскі раён: 116) Магілеў; д) чачэвіцкі раён: 117) Кавалёўка чыгірынскага сс., 118) Жмакі падсельскага сс., 119) Колбава чыгірынскага сс., 120) пас. імя Дзяржынскага грыбавецкага сс., 121) Падсёлы падсельскага сс.,) 122) Чачэвічы, 123) Боркі грыбавецкага сс.; е) чэрыкаўскі раён: 124) Лабанаўскага сс., 125) Шароеўка шароеўскага сс.; VI. мазырская акруга: а) азарыцкі раён; 126) Савічы савіцкага: б) жыткавіцкі раён: 127) Зорка; в) капаткевіцкі раён: ва ўсім раёне згодна вестак раённага таварыства краязнаўства, г) каралінскі раён: 129) Ельск; д) лельчыцкі раён: 130) Сініцкае поле сініцка-польскага сс.; е) нараўлянскі раён: 131) Нароўля; ж) петрыкаўскі раён: 132) Петрыкаў; з) юравіцкі раён: 133) Алексічы; VII. менская акруга: а) барысаўскі раён: 134) Барысаў, 135) в. Неманіца, 136) Углы, 137) Ракашыцы сямёнаўскага сс.; б) грэскі раён: 138) Боркі палікараўскага сс., 139) Апаліны палікараўскаг сс., 140) Рагі сялецкага сс., 141 Грэск, 142) Мусічы, 143) Вужа грозаўскага сс., в) заслаўскі раён: 144) Новы Двор нова-дворскага сс., 145) Манылы шаршунскага сс., 146) Кіршы заслаўскага сс., 147) Шубнікі барздынскага сс., 148) Казекава, гатавіцкага сс.; г) капыльскі раён; 149) Андросаўшчына вялешынскага сс., 150) Станькі евангсьлевіцкага сс.; д) лагойскі раён: 151) Лагойск, 152) Рудня лагойскага сс., 153) Якубавічы баравыя янушкаўскаўга сс., 154) Н. Радзевічы слабадзкога сс., 155) Гасьцілавічы лагойскага сс., 157) Моладзі чоркаўскага сс.; е) пухавіцкі раён; 158) Пухавічы; ж) халопеніцкі раён: 159) Ліпавец; з) чэрвенскі раён: 160) Градно раваніцкага сс., 162) Чарнава руднянскага сс.; VIII полоцкая акруга: а) асьвейскі раён: 162 Максімава; б) валынецкі раён: 163) Сьвіраўшчына галубоўскага сс., 164); в) Юзафова; в) ветрынскі раён: 165) Пяцюлёва ветрынскага сс.; г) лепельскі раён: 166) Свабодны Пахар стайскага сс., 167) Весялова весялоўскага сс.; д) полацкі раён: 168) Пошт юравіцкага сс., 169) Палесьсе юравіцкага сс.; е) расонскі раён: 170) Каранец парэцкага сс.

Даведачная літатура аб зямляўласьніках былых менскай, віцебскай, магілеўскай, віленскай, смаленскай і ковенскай губ. таксама сьведчыць аб існаваньні прозьвішча з асновай волат на тэрыторыях апошніх, але гэтых даных я не скарыстоўваю з тае прычыны, што яны могуць быць у некаторых, праўда вельмі нешматлічных, выпадках прыбылымі ў даную мясцовасьць з прычыны куплі ці насьледваньня зямлі.

Другая назва волатаў, люцічы, таксама захавалася ў старажытных докумэнтах, называючы або географічныя об'екты: Люта, Лютае, Лютангауз, р. Лютыніч, Лютава, Лютаўка, Лютыкі, Люцін, Лютагошча, Лютамля і інш., або іменьні, прозьвішчы, і мянушкі людзей: Лютастанскі, Лютаноўскі [157]), Люцік, Лютавор, Лютачэвіч і інш. [158]). Яны таксама, як і назва волатаў у напісаньнях выданых докумэнтаў часамі відазьмяняюць у сабе толькі гукі, часамі — цэлыя часткі слоў, як гэта відаць і з названых прыкладаў.

У сучаснай даведачнай і апісальнай літаратуры [154]) ёсьць таксама шмат географічных назваў з асноваю лют. Да іх належаць: 1) р. Лютынін, 2) воз. Лютавец б. асуньскай вол., б. дзьвінскага пав. б. віцебскай губ.; 3) р. Люціца, левы прыток р. Жыжца, прытока Дзьвіны; 4) р. Люцініца, правы прыток Дзьвіны; 5) р. Люціца, левы прыток Стыру, прытока Прыпяці; 6) р. Люцінка, правы прыток Бярозы нёманскай і 7) балота Люцень на р. Морач, а таксама шэраг паселішчаў: I у б. смаленскай губ.—8) Лю-

тая б. красьнінскага пав; II у б. віцебскай губ.—9) Лютчыцы б. гарадчэўскай вол., 10) Люцкі б. чарсьвяцкай вол. б. лепельскага пав.; 11) Люцішы б. пылдзенскай вол. і 12) Люцін б. люцінскага пав.; 13) Люцькава б. аляксандраўскай вол. і 14) Лютава б. полацкага пав.; 15) Люці б. Юхавіцкай вол. б. дрысенскага пав.; 16) Лютаўцы б. асуньскай вол. б. дзьвінскага пав.; 17) Лютаўка б. рэжыцкага пав.; 18) Люцікі б. руднянскай вол., б. гарадоцкага пав.; 19) Люціха б. долыскай і 20) Люцькава б. кубецкай вол., б. нэвельскага пав.; III у б. ковенскай губ.—21) Люткуны б. лігумскай вол. і 22) Лютыкі б крупяўскай вол. б. шавельскага пав.; 23) Люткайце б. батоцкай вол. б. расіенскага пав.; 24) Люцюны б. курклеўскай




Картаграма паселішчаў з коранем лют— у назьве [паводле даведачнай літаратуры].

вол. б. вількамірскага пав.; 25) Люткуны б. разалінскай вол. б. панявескага пав.; 26) Люткуны б. янаўскай вол. б. ковенскага пав.; IV у б. віленскай губ.—27) Люціца, б. пліскай вол., б. дзісьненскага пав.; 28) Люташ б, вішнеўскай вол. б. ашмянскага пав.; 29) Люцішкі б. дубіцкай вол. б. лідзкага пав.; 30) Лютаны б. жыжморскай вол.; 31) Люценішкі б. высокадворскай вол. троцкага пав.; 32) Лютыка б. падбярэскай, 33) Люціны і 34) Люцяны б. немянчынскай вол. б. віленскага пав.; 35) Люцін, 36) Люцін, 37) Люцін, 38) Люцін і 39) Люцін б. германіскай вол. і 40) Люцевівы б. княгініцкай вол. б. вілейскага пав.; V у б. горадзенскай губ. — 41) Люцічы б. райскай вол. б. бельскага пав.; 42) Люта б. лышчыцкай вол. б. берасьцейскага пав.; 43) Лютыш б. пяскоўскай вол. і 44) Люцьвіны б. курылавіцкай вол. б. слонімскага пав.; VI у б. менскай губ. 45) Люцін, 46) Падлюціі б. цытвянскай вол., 47) Сталютава б. сьмілавіцкай вол. б. ігуменскага пав.; 48) Лютавічы; 49) Лютавічы б. вызьнянскай вол. б. слуцкага пав.; 50) Люцінка і 51) Люцінка б. пяршайскай вол. б. менскага пав.; 52) Люцінава б. лагойскай, 53) Люцец і 54) Люцец б. красналукскай

вол. б. барысаўскага пав.; 55) Люцін і 56) Лютае б. пенскага пав. 57) Люцін б. бацэвіцкай і 58) Люціна б. сьвіслацкай вол. б. бабруйскага пав.; 59) Залюцічы б. ленінскай вол. і 60) Залюцьце і 61) Залюцьце б. лахаўскай вол. б. мазырскага пав.; VII у б. магілеўскай губ.—62) Люцін б. прапойскай вол. і 63) Люткава б. глускай вол. б. быхаўскага пав.; 64) Люціна б. маслакоўскай вол. б. горкаўскага пав.; 65) Лютыя б. абчускай вол. б. сянскага пав.; VIII чарнігаўскай губ. — 66) Люты і 67) Люты сярэдзіна-будзкага раёну ноўгарад-северскай акругі; 68) Лютаўка сноўскага раёну, 69) Лютаўка сіняўскага раёну; 70) Люцеж тупічэўскага раёну сноўскай акругі.

Апрача памянёных, паведамленьні на анкету выявілі наступныя назвы географічных об'ектаў з асноваю лют: 1 аршанская акруга: а) амсьціслаўскі раён: Люцічы, Лютня; б) дубровенскі раён: 71) Люцічы; 72) р. Лютына; в) капыскі раён: 73) Люціны якаўлевіцкага сс., 74) Алюты; 75) ур. Люцкавічы аляксандраўскага сс.; г) талачынскі раён; 76) ур. Люцькавы ля Баранцэвіч воўкавіцкага сс., 77) ур. Люты ля Талачына; 78) Люта ля Славен; д) чарэйскі раён: 79) в. Люты абчускага сс., 80) Люцявінка заборскага сс.; II бабруйская акруга: а) бабруйскі раён: 81) в. Люцін; б) жлобінскі раён: 82) ур. Люці казіміраўскага сс.; в) клічаўскі раён: 83) в. Люціна; г) парыцкі раён: 84) ур. Люткаў ля Чыркавіч чыркаўскага сс., 85) в. Лютгардаўка; д) рагачэўскі раён: 86) ур. Лютаўка пабалаўскага сс., 87) ур. Палюта пабалаўскага сс.; 88) ур. Палюціньне ля Ліскоў пабалаўскага сс.; 89) ур. Люцянка пабалаўскага сс.; е) слуцкі раён: 90) в. Люцянец; 91) Люцічы; ж) старобінскі раён: 92) воз. Люцень; 93) х. Люцень краснадворскага сс., 94) канава Люценская, 95) в. Лютавічы; 96) сенажаць Люцічы ля Пагосту пагоскага сс., з) сьвіслацкі раён: 97) в. Люцін віркаўскага сс.; і) чырвонаслабодзкі раён: 98) в. Лютавічы; III віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 99) в. Сялюціна асінаўскага сс.; 100) в. Люткі механаўскага сс.; 101) в. Люцікі руднянскага сс.; б) высачанскі раён 102) Люцьвінава, 103) Сялюты; г) чашніцкі раён: 104) в. Люцічы; IV гомельская акруга; а) брагінскі раён: 105) ур. Люцік ля Собаляў; б) будакашалёўскі раён: 106) Лютаў хутар; в) гомельскі раён: 107) в. Люцічы; г) уваравіцкі раён: 108) р. Люцік гусявіцкага сс., 109) поле Люткаўскае ля Уваравіч; д) хойніцкі раён: 110) ур. Люцічы каля Маканавіч, 111) в. Люць-




Картаграма географічных назваў з коранем лют— паводле даных анкеты і экспэдыцыі 1928 г. [без паказаных у папярэдняй].

він; V магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 112) Люткоў хаўстоўскага сс., б) клімавіцкі раён: 113) в. Лютароўка; 114) р. Лютня; б) краснапольскі раён: 115) Люцень; г) лупалаўскі раён: 117) в. Лютыкі; 118) в. Алюты; д) прапойскі раён: 119) в. Люцягі; е) чэрыкаўскі раён: 120) в. Лютраўка, 121) Люцішча, 122) Лютныя палоскі ля Шароеўкі; VI мазырская акруга: а) каралінскі раён: 123) ур. Лютаўка ля Падволі рамезаўскага сс.; б) лельчыцкі раён: 124) в. Люцічы, 125) Лютае балота грабянёўскага сс.; в) петрыкаўскі раён: 126) ур. Лютае, 127) в. Сялюцічы грабаўскага сс., 128) Люцічы; VII менская акруга: а) астрашыцка-гарадзецкі раён: 129) в. Валюты; б) вузьдзенскі раён: 130) Люцьвяны; в) грэскі раён: 131) балота Люцічы слабадзкога сс.; 132) в. Лютавічы, 133) воз. Люцень; г) заслаўскі раён: 134) в. Сялюты сёмкава-гарадзецкага сс., 135) в. Люцічы; д) капыльскі раён: 136) в. Лютавічы; е) плешчаніцкі раён: 137) х. Люцікі; ж) пухавіцкі раён: 138) в. Люці; 139) ур. Люцін ля Хідры балоцкага сс., 140) ур. Люцін ля Рэпішча; 141) канава Люцін таксама; 142) ур. Люцін ля Бялочы; з) смалявіцкі раён: 143) в. Люткі жажэлкаўскага сс.; і) чэрвенскі раён: 144) ур. Люцін ля Ачыжы; VIII полацкая акруга: а) ветрынскі раён: 145) х. Люткевічава Нача шпакоўскага сс., 146) ур. Люцец ветрынскага сс.; б) лепельскі раён: 147) в. Люцічы палянскага сс.; 148) х. Лючыцы палянскага сс.; 149) х. Люцічы, в) полацкі раён: 150) в. Лютаўка; г) расонскі раён: 151) воз. Лютае[41]).

Колькасьць новавыяўленых у БССР назваў географічных об'ектаў з коранем лют, таксама, як і назваў з асноваю волат перавышае лік і іх на тэрыторыі ўсёй этнографічнай Беларусі вядомы з папярэдняй літаратуры; на адзін сучасны раён прыпадае часамі больш гэтых новых назваў, чым вядомых з літаратуры на ранейшы павет.

Побач з гэтым азначаныя паведамленьні на анкету аб волатах выявілі існаваньне іменьняў, прозьвішч і мянушак: Люціна, Люцягін, Люцячонкі, Лют, Лютынскі, Бязьлют, Люцін, Люцік, Люцінкевіч, Люта, Люцька, Люцьвяк, Лютынскі, Лютэцкі, Люцьвік, Люцягін, Лютык, Лютвін, Лютарэвіч, Люташэвіч, Люціч, Люцічын, Алюта, Люткевіч, Люцка, Улюта, Суклюта, Люцевіч, Лютар, Люціч, Люцічымскі, Люцяга, Лютакоў, Лютэвіч, Лютня, Лютыка, Лютман, Лютгараў, Люцянскі, Лютгонскі, Лютра, Люцічаў, Лютава, Люты,Люцін, Лютрашэвіч, Лютроўскі, Люцярыніч, Лютарэвіч, Лютняк, Лютовіч; Лютка, Люшкоўскі, Люцкевіч, Лютаўскі, Люцьвін, Лютык, Люценскі і інш. у наступных паселішчах і іх ваколіцах: I аршанская акруга: а) амсьціслаўскі раён: 1) Амсьціслаў, 2) Заціш'е лапацінскага сс.; б) капыскі раён: 3) Хімы дубраўскага сс.; в) коханаўскі раён; 4) Сьцепашкоўшчына вяліка-гольцаўскага сс.; 5) Пунчына старасельскага сс.; 6) Кісялі вяліка-гольцаўскага сс., 7) ур. Люціна ля Высокага коханаўскага сс.; 8) ур. Халюціна ля высокага коханаўскага сс., г) круглянскі раён: 9) ур. Люцеўшчына ля Ахімкавіч I, каменецкага сс.; д) крупскі раён: 10) Лютыя сакаловіцкага сс.; е) расьнянскі раён: 11) Забалацьце; 12) Рабяшкі; 13) Міхайлаў забалацкага сс.; ж) талачынскі раён: 14) Ганчароўка воўкавіцкага сс.; 15) Славень славенскага сс.; 16) Талачын, 17) Красілава яўлахаўскага сс., 18) Халопкавічы, 19) Трасьцянка ўльянаўскага сс., 20) Варанцэвічы воўкаўскага сс., 21) Зайкаўшчына; з) чарэйскі раён: 22) Лукамль; II бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 23) Старонка карытнянскага сс., б) бабруйскі раён: 24) Боркі восаўскага сс., 25) Рыня міхалеўскага сс., 26) Страўнішчы падрэцкага сс., 27) Курганы любоніцкага сс., 28) Забэльле лешчанскага сс., 29) Любонічы любоніцкага сс., 30) Віжады баравіцкага сс.; в) глускі раён: 31) Падзамша хвастовіцкага сс., 32) Піра-

вічы; г) парыцкі раён: 33) Чыркавічы чыркавіцкага сс., 34) Тур. Слабада туркаўскага сс.; д) слуцкі раён: 35) Сярагі сяраскага сс.; 36) Квасьнічы цараўскага сс., 37) Дорасіно дарасінскага сс., 38) Панічы дарасінскага сс., 39) Кляпчаны; е) старадароскі раён: 40) Церабуты шчыткавіцкага сс. 41) Сяльцо мяцявіцкага сс.; III віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 42) Будніца хвашнянскага сс.; б) бешанкавіцкі раён: 43) Сьвіціна чаркаскага сс.; в) віцебскі раён: 44) Ярмолкава войтаўскага сс., 45) Маркаўшчына, 46) Мяккія, 47) Благія; г) высачанскі раён: 48) Шаўкунова, 49) Сьцепаненкі; д) лёзьненскі раён: 50) Васюціна веляшкоўскага сс., 51) Амільлянова гладанскога сс.; е) межанскі раён: 52) Фралова вышадзкага сс., 53) Вышадкі вышадзкага сс.; ж) сянскі раён: 54) Маркаўшчына машканскага сс.; з) сіроцінскі раён; 55) Вароньки лаўжанскага сс.; і) чашніцкі раён: 56) Ступіна цяпінскага сс.; IV гомельская акруга: а) будакашалёўскі раён: 57) Лютаў хутар ля Зялёнай Дубровы; 58) Шутнае, 59) Дзедаў Курган, 60) Заборкі забабскага сс.; б) гомельскі раён: 61) Гомель; в) уваравіцкі раён: 62) Красная Хачэмля гусявіцкага сс. г) чачэрскі раён: 63) Глыбочыцы глыбочыцкага сс.; V магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 64) Быхаў; б) касьцюковіцкі раён: 65) Пячары пячарскага сс.; в) клімавіцкі раён: 66) Аляксандраўка; 67) Асіньнікі цімаНоўскага сс., 68) Мядзьведзі; 69) Клімавічы; г) краснапольскі раён: 70) Пачопы пачопаўскага сс.; 71) Хведараўка кажамякінскага сс.; д) крычаўскі раён: 72) Слабуты маляціцкага сс., 73) Шаеўка; а) магілеўскі раён: 74) Магілеў; ж) чавускі раён: 75) Воўкавічы воўкавіцкага сс.; з) чачэвіцкі раён: 76) Чарнагразь, 77) Падсёлы падсельскага сс.; 78) Падліпкі; і) чэрыкаўскі раён: 79) Сячыхі губіншчынскага сс., 80) Лютраўка, 81) Чэрыкаў; 82) Шароеўка; VI мазырская акруга: а) жыткавіцкі раён: 83) Жыткавічы, 84) Сялко людзяневіцкага сс.; б) нараўлянскі раён: 85) Нароўля; в) петрыкаўскі раён: 86) Белкі, 87) Петрыкаў, 88) Навасёлкі белкаўскага сс., 89) Аголічы; VII менская акруга: а) астрашыцка-гарадзецкі раён: 90) Карпілаўка, 91) Весьніна астрашыцкага сс.; б) барысаўскі раён: 92) Цёмны Лёс., 93) Барысаў, 94) Брылёў касьцюкоўскага сс., 95) Лазін забашанскага сс., 96) Забашавічы; в) бягомльскі раён: 97) Федаркі кадлубішчанскага сс., 98) Вітунічы вітуніцкага сс.; г) вузьдзенскі раён: 99) Галавачы магілянскага сс., 100) Сеяцель прысыпскага сс., 101) Узда; д) грэскі раён:




Карта раёнаў, у якіх засьведчана бытаваньне прозьвішч з коранем лют [паводле даных анкеты і экспэдыцыі 1928 г.].

102) Боркі палікараўскага сс., 103) Апаліны палікараўскага сс., 104) Мусічы, 105) Вужа грозаўскага сс.; е) заслаўскі раён: 106) Мацкі слабадзкога сс., 107) Меткава барздынскага сс.; 108) Заслаўе, 109) Шубнікі, 110) Засьценак гарадзецкага сс., 111) Ляскаўка калодзінскага сс., 112) Лабэншчына, 113) Гуры, 114) Лукашы праскоўскага сс., 115) Тарасава ратамскага сс.; ж) капыльскі раён; 116) Капыль, 117) Заракаўкі браткаўскага сс.; з) лагойскі раён: 118) Лагойск, 119) Рудня лагойскага сс.; і) пухавіцкі раён: 120; Слонішча сяргееўскага сс.; к) самахвалавіцкі раён: 121) Вербнікі самахвалавіцкага сс., 122) Прылукі, 123) Самахвалавічы, 124) племгас Русінавічы; л) сьмілавіцкі раён: 125) Карзуны карзуноўскага сс.; 126) Гудавічы карзуноўскага сс., м) чэрвенскі раён: 127) Градно раваніцкага сс., 128) Р. Слабодка раваніцкага сс., 129) Вінаградаўка, 130) Карабетаўка дамавіцкага сс., 131) Бялічаны бялічанскага сс., 132) Сушнікі дамавіцкага сс.; VIII полацкая акруга: а) асьвейскі раён: 133) Прошкі красоўскага сс.; б) валынецкі раён: 134) Вадвахалева прудзінкаўскага сс., 135) Лявонішана юзафоўскага сс.; в) ветрынскі раён: 136) Кеўлена лагавая нацкага сс., 137) Арэхаўка нацкага сс., 138) Кабакова наўліцкага сс., 139) Хацевічы вараноўскага сс., 140) Наўліці наўліцкага сс., 141) Нача лютынская, 142) Жаўнеркі, 143) Заазер'е гарадоцкага сс., 144) Пяцюлёва ветрынскага сс., 145) Варонечы вароніцкага сс.: г) дрысенскі раён: 146) Гайжанова жаўнянскага сс., 147 Патрабова цястаўскага сс., 148) Трыбісы; д) лепельскі раён: 149) Вольны араты стайскага сс., 150) Лепель, 151) Ст. Валосавічы, 152) Весялова весялоўскага сс., 153) Альховічы пышнянскага сс.; е) полацкі раён: 154) Куты сястронскага сс., 155) Скобрыя юравіцкага сс., 156) Здродавічы дамнікоўскага сс.; ж) расонскі раён: 157) Сітнякі краснаборскага сс., 158) Альбрэхтава альбрэхтаўскага сс.; IX з-за меж БССР: 159) Дзьвінск (Латгалія) [41]). Аднэй канаве дадзена была назва Лютня за лютасьць прыказчыка, пры якім сяляне капалі канаву. У шэрагу мясцовасьцяй сярдзітым сабакам даюць назвы: Лютня, Лютка, Лютыка, Лютра і д. т. п. [159]).

Але непараўнальна большая за гэтыя дзьве групы назваў трэцяя назва волатаў—ваўкі, як у старажытных докумэнтах, так і ў сучаснай запраўднасьці. У першых яна спатыкаецца таксама ў match розностайных формах як у галіне геаграфічных назваў: Вількея, Вількакук, Ваўчок, р. Валкабрынская, Ваўкавічы, р. Ваўкуша, Воўкаўшчына, Ваўкавыск, Вількаў, р. Вількіта, Ваўчана, Воўкава, Ваўкаўня, р. Ваўчаса, Воўчыя горы, Воўчая яма, Воўчая града, Воўча, Ваўчынцы, Вілка-езёры, Ваўкарабішкі, Ваўкаўшчызна, Вільканцы, р. Ваўкуша, Ваўкалат, р. Воўчына, Ваўчынец, Ваўкавяны, Вількамер, Вількінікі, Вільчары, Вілкшылі, Вілканіс, воз. Ваўчынец, Ваўкідзішкі, Вількарос, Ваўкоўна, Ваўкавыя, Вільчыцы р. Воўка, Воўчае, Вількія, Ваўкаўцы, Воўкаўскае, Ваўкалата і д. т. п. [160]), так і ў галіне іменьняў, прозьвішчаў і мянушак: Воўк, Вільчак, Ваўчацкі, Ваўкавіцкі, Вільчкова, Ваўчок, Воўкава, Ваўковіч, Вільчынскі, Вільчан, Вількіновіч, Вількевіч, Ваўкавыскі, Вэўкавачова, Ваўканоўскі, Ваўчанскі, Ваўкоўскі, Воўкавы, Ваўчэцкі, Вільчэўскі, Ваўчапольскі, Ваўкавічоўна, Ваўчковіч, Ваўковая, Вілкас, Ваўкалат і д. т. п. [161]).

Шматлічнае існаваньне падобных назваў геаграфічных паселішчаў засьведчана ўсё тэй-жа даведачнай і апісальнай літаратурай [154]) Так І у смаленскай губ. ёсьць наступныя паселішчы: 1) Воўкава, 2) Воўкава, 3) Воўкава дарагабускага павету, 4) Воўкава, 5) Воўкава, 6) Воўкава, 7) Воўкава вяземскага пав., 8) Воўкава, гжацкага пав., 9) Воўкава, 10) Воўкава, 11) Воўкава духаушчынскага пав., 12) Ваўкі, 13) Ваўкі, 14) Ваўкі, 15) Ваўкі, 16) Ваўкі, 17) Воўкава, 18) Воўчая града парэц-

кага пав., 19) Ваўкі, 20) Воўкава, 21) Воўкава, 22) Ваўчкова, 23) Ваўкоўка бальшая, 24) Ваўкоўка малая сычаўскага пав., 25) р. Ваўчэйка, 26) Ваўчэйка, смаленскага пав., 27) Воўкава, 28) Воўкава Юр'е, 29) Воўкава Буда, 30) Воўкава Буда, 31) Ваўкоўка ельнінскага пав., 32) Воўкава, 33) Ваўкачаны, юхнаўскага пав., 34) Воўкава, 35) Воўкава, 36) Воўкава, 37) Ваўковічы красьнінскага пав., 38) Воўкава, 39) Воўкава, 40) Воўкава, 41) Воўкава, 42) Воўкава, 43) Ваўчышчава, 44) Ваўчышчава, 45) Воўкава бельскага пав., 46) Ваўкарэзіна, 47) Ваўкарэзіна, 48) Ваўкарэзіна, 49) Воўкава, 50) Воўкавічы, 51) Воўкавічы рослаўскага пав.; II у віцебскай губ.—52) Вылкі, 53) Ваўкаўшчызна вышкаўскай вол., 54) Выўкі, 55) Вылкмеры калубскай вол., 56) Выкмеры прэльскай вол., 57) Вылкопы варкоўскай вол,, 58) Вілка-Корчма, 59) Вілкамеж унгермуйскай вол., 60) Вілкі капінскай вол., 61) Вілкоі калубскай вол., 62) Вілкопы варкаўскай вол., 63) Воўкаўка вышкаўскай вол. дзьвінскага пав., 64) Воўкаедзь узьнесенскай вол., 65) Ваўкі тураўлянскай вол., 66) Ваўкі петрапаўлаўскай вол., 67) Ваўчкі андрэеўскай вол., 68) Воўкава аляксандраўскай вол. полацкага пав., 69) Вылкоі стэрнянскай вол., 70) Вылка-Круча каўнацкай вол., 71) Вылка-Сола кульнеўскай вол., 72) Вылка-Дзегун розэнтаўскай вол. рэжыцкага пав., 73) Ваўконка, 74) Ваўконка, 75) Ваўконка, 76) Ваўконка, 77) Ваўконка курынскай вол., 78) Ваўкарэзьніца храпавіцкай вол., 79) Ваўкунь, 80) Ваўкунь вярхоўскай вол., 81) Воўчкава жарабыцкай вол., 82) Воўчкава, 83) Воўчкава шчэрбінскай вол., 84) Воўкава сялюцкай вол., 85) Воўкава старасельскай вол. віцебскага пав., 86) Ваўкі дзярновіцкай вол., 87) Вількелева стрыжынскай вол. 88) Воўкаеды пустынскай вол. дрысенскага пав., 89) Ваўкі паташынскай вол., 90) Ваўкі вобальскай вол., 91) Ваўкі-Савонава болецкай вол. гарадоцкага пав., 92) Воўкава сакольніцкай вол., 93) Бел. Воўкава, 94) Мал. Воўкава, 95) Воўкава долыскай вол., 96) Воўкава шалахоўскай вол. нэвельскага пав., 97) Воўкаванава прыхабскай вол., 98) Вылькава сутоцкай вол., 99) Воўкава чарнейскай вол. себескага пав., 100) Ваўкарэзы істрскай вол., 101) Вылкава бальцінаўскай вол., 102) Вылкава бальцінаўскай вол., 103) Вылкава болаўскай вол., 104) Вылкарус болаўскай вол., 105) Вылкадубы зальмыскай вол., 106) Вілкава, 107) Вілкава бальцінаўскай вол., 108) Вільчаполе марыенгаўзенскай вол. люцынскага пав., 109) Воўчкава, 110) Воўчкава, 111) Воўчкава ветрынскай вол., 112) Воўча, 113) Воўча вушацкай вол. лепельскага пав., 114) Воўкава, 115) Воўкаўскія вяліскага пав.; III уменскай губ.—116) Воўкаўшчына ланьскай вол., 117) Воўка вызьненскай вол., 118) Воўкаў старобінскай вол., 119) Воўчая завастравецкай вол. слуцкага пав., 120) Вільча, 121) Вільча ленінскай вол., 122) Ваўчкова каралінскай вол., 123) Воўчае скароднікаўскай вол. мазырскага пав., 124) Ваўкавыск, 125) Ваўкавыск грэбеньскай вол., 126) Ваўчэй пагосцкай вол., 127) Ваўчыцы амельянскай вол. ігуменскага пав., 128) Воўчы, 129) Ваўкаўня гарбацэвіцкай вол., 130) Ваўчное ляскавіцкай вол., 131) Вільча, 132) Вільча гарадоцкай вол., 133) Ваўчынец сьцяпской вол. бабруйскага пав., 134) Ваўкі койданаўскай вол., 135) Воўка койданаўскай вол., 136) Воўкаўшчына заслаўскай вол., 137) Воўчкавічы, 138) Воўчкавічы самахвалавіцкай вол., 139) Воўкаўшчына сеньніцкай вол., 140) Воўкаўшчына, 141) Ваўкаўшчызна беларуцкай вол. менскага пав., 142) Воўкавічы, 143) Воўкавічы, 144) Воўкавічы гарадзечанскай вол., 145) Воўкапут чарніхоўскай вол., 146) Ваўчыца мірской вол., 147) Ваўкарэзь любчанскай вол., 148) Ваўкаўшчына гарадзейскай вол. навааградзкага пав., 149) Воўча бягомольскай вол., 150) Ваўкаўцы прусевіцкай вол., 151) Воўкаўшчына зембінскай вол., 152) Воўкаўшчына есьманскай вол.

барысаўскага пав., 153) Воўчына угрынецкай вол., 154) Ваўчыцы марачанскай вол. пінскага пав., 155) Ваўкашанка холмецкай вол., рэчыцкага пав.; IV—у сувалскай губ. — 156) Вілкупэ, 157) Вілкопэдзе сувалкскага пав., 158) Вількаўцы, 159) Вількія, 160) Вількенікі, 161) Вілконосты, 162) Вількакук, 163) Вількакук, 164) Вількакук, 165) Вількакук, 166) Вілкас сэйненскага пав., 167) Вількеніца, 168) Вільча, 169) Ваўкавізна кальварыйскага пав. 170) Вількенішкі, 171) Вілкшакаб, 172) Вілкупэ, 173) Вілкішкі ўладзіслаўскага пав., 174) Ваўкушне, 175) Ваўкуш, 176) Вількава аўгустоўскага пав., 177) Ваўкавышкі, 178) Ваўкавышкі, 179) Ваўкавышкі, 180) Вількішкі, 181) Вілкупэ, 182) Вілкупэ, 183) Вілкоболе, 184) Вілкоболе




Картаграма паселішчаў з асноваю воўк у назьве [паводле даных даведачнай літаратуры].

ваўкавыскага пав.; V у горадзенскай губ.—185) Воўчын, воўчынскай вол., 186) Ваўчкі ратайчыцкай вол., 187) Ваўкі радваніцкай вол., 188) Воўкавічы выс.-літоўскай, 189) Воўкаставец вярховіцкай вол., 190) Воўкавічы, выс.-літоўскай вол., 191) Воўкавічы, 192) Воўкавічы выс.-літоўскай вол., 192-а) Воўкаставец вярховіцкай вол., 193) Воўчын, 194) Воўчын воўчынскай вол. брэскага пав., 195) Ваўчэўе быцянскай вол., 196) Воўчы Лес дзятлаўскай вол., 197) Ваўчкі мяжэвіцкай вол., 198) Ваўчкі мяжэвіцкай вол., 199) Ваўчыны дзеравенскай вол., 200) Воўчыя Норы марынскай вол. слонімскага пав., 201) Воўкуш, 202) Воўкуш, круглянскай вол., 203) Воўчая Яма каменкоўскай вол., сакольскага пав., 204) Воўкацеча сялецкай вол. пружанскага пав., 205) Ваўкавыск, 206) Ваўкавыск, 207) Вілкі ваўкавыскага пав., 208) Воўкава азяцкай вол., 209) Воўкавічы рагазьнянскай вол., 210) Воўкавічы рагазьнянскай вол. кобрынскага пав.; VI—у магілеўскай губ.—211) Вільчыцы, 212) Вільчыцы вейнянскай вол., 213) Воўканосава круглянскай вол., магілеўскага пав., 214) Ваўкалакі, горскай вол., 215) Ваўчок голенеўскай вол. чавускага пав., 216) Воўка-

вічы бал., 217) Воўкавічы мал. грудзінаўскай вол. быхаўскага пав., 218) Ваўкавыскі бобрскай вол. сянскога пав., 219) Ваўкавіцкі Крупец целяшоўскай вол. гомельскага пав., 220) Воўкаўшчына, 221) Воўкаўшчына горацкай вол. горацкага пав., 222) Ваўкалакава дубровенскай вол. горацкага пав., 223) Ваўчкова добрамысьлянскай вол., 224) Воўкавічы старалачынскай вол., 225) Ваўкавічы алёнавіцкай вол., 226) Воўкава руднянскай вол., 227) Воўкава, 228) Воўкава, 229) Воўкава любавіцкай вол., 230) Ваўкі мікуліцкай вол. аршанскага пав., 231) Воўкаўка беліцкай вол. чэрыкаўскага пав., 232) Ваўкаўцы старасельскай вол. амсьціслаўскага пав.; VII у чарнігаўскай губ.—233) Воўчая Гара нежынскай акругі, 234) Воўчык канатопскай акругі, 235) Вільчыкі ноўгарад-северскай акр., 236) Воўчкаўскі, 237) Воўчак чарнігаўскай акр.; VIII у віленскай губ.—238) Ваўкі богінскай вол., 239) Ваўчкі глыбоцкай вол., 240) Воўчае Поле, 241) Воўкаўшчына, 242) Воўкаўшчына ёдзкай вол., 243) Воўкава лужацкай вол., 244) Воўкава, 245) Воўкава, 246) Воўкава, 247) Воўкава мікалаеўскай вол., 248) Ваўчкі нова-пагосцкай вол., 249) Воўкаўшчына перабродзкай вол., 250) Воўчая Гара перабродзкай вол., 251) Воўкава чарневіцкай вол. дзісьненскага пав., 252) Ваўчынкі васіліскай вол., 253) Воўк, 254) Ваўкі жырмунскай вол., 255) Воўкавічы, 256) Ваўчкі жолудзкай вол., 257) Ваўкаўцы лідзкай вол., 258) Ваўчкі, 259) Ваўчкі 260) Ваўчкі арлянскай вол., 261) Воўкавічы радунскай вол., 262) Вільканцы, 263) Вільканцы эйшынскай вол., лідзкага пав., 264) Ваўкаўшчызна, 265) Ваўкаўшчызна гальшанскай вол., 266) Ваўкаўшчызна дзевеніскай вол., 267) Ваўкі крэўскай вол., 268) Ваўкі лугамовіцкай вол., 269) Воўка налібоцкай вол., 270) Ваўкаўшчызна палянскай вол., 271) Воўка налібоцкай вол, ашмянскага пав., 272) Вількошня сумеліскай вол., 273) Валкойці ганушынскай вол., 274) Вількішкі, 275) Вількішкі, 276) Вількоболе еўеўскай вол., 277) Вількішкі, 278) Вількішкі, 279) Волкокемя жосельскай вол., 280) Вількішчызна кронскай вол. троцкага пав., 281) Вількіне кукуціскай вол., 282) Вількарыя лынгмянскай вол., 283) Вількаполь кукуціскай вол., 284) Вількокайніс, 285) Вількорайсьціс лынгмянскай вол., 286) Вількорабішкі рудамінскай вол. сьвянцянскага пав., 287) Вількорабішкі рукойніцкай вол., 288) Воўчча Лапа рудамінскай вол., 289) Воўкарабішкі рукойніцкай вол., 290) Ваўкштомы чумскай вол., 291) Вілкамуша, 292) Вілкройсьця, 293) Вілкосьласьціс, 294) Вілкомуша яніскай вол., 295) Воўкаўшчына, 296) Воўкаўшчына, 297) Воўкаўшчына, 298) Ваўчуны, 299) Ваўчыны Дольныя, 300) Ваўчыны, 301) Ваўчуны, 302) Ваўчуны, 203) Воўчая Лапа рудамінскай вол., 304) Вілкорайсьце яніскай вол,, 305) Ваўчкі крывіцкай вол., 306) Ваўкаўшчына, 307) Ваўкі краснасельскай вол., 308) Воўкаўшчына, 309) Воўкаўшчына крайскай вол., 310) Ваўскі князінінскай вол., 311) Воўкаўшчызна, 312) Воўкаўшчызна вілейскай вол., 313) Ваўкалата будслаўскай вол., 314) Воўчы Лог гарадоцкай вол,, 315) Ваўчкі германіскай вол., 316) Ваўкалата, 317) Ваўкалата, 318) Ваўкалата, 319) Ваўкалата ваўкалацкай, 320) Воўкава парпліцкай вол., 321) Воўкаўшчына, 322) Воўкаўшчына, 323) Ваўкі навіцкай вол., 324) Ваўкі маладэчынскай вол., 325) Воўчын, 326) Ваўкі манькавіцкай вол., 327) Ваўчкі крывіцкай вол., 328) Вількутаны ўцянскай вол., 329) Воўкагулі, 330) Вількшыкі ільінскай вол., 331) Вількінцы, 332) Вількінцы быстрыцкай вол., 333) Вількішкі маляцкай вол., 334) Вількінка, 335)Ількарайсьце неменчынскай вол.; IX—у ковенскай губ. — 336) Вількяны, 337) Вількяны швекшнянскай вол., 338) Вількішкі эржвілаўскай, 339) Вількішкі расіенскай вол., 340) Вількішкі шыдлоўскай вол., 341) Вількі вэвіржанскай вол., 342) Вілкупэ расіенскай вол., 343) Вілкулаўкі паюрскай вол., 344) Вілкукомпэ швекшнян-

скай вол., 345) Вілкверце крокскай вол. расіенскага пав., 346) Воўка крокскай вол., 347) Вільчатава, 348) Вільчатава, 349) Вільчатава, 350) Вількішкі бабтоўскай вол.. 351) Вількі сурвеліскай вол., 352) Вількі, 353) Вількі вількійскай вол., 355) Вілкайце кейданскай вол., 356) Воўкаўшчына янаўскай вол. ковенскага пав., 357) Ваўкі вепраўскай вол., 358) Вількросьціс каварскай вол., 359) Вількатанцы каварскай вол., 360) Вількішкі жмуйдзецкай вол., 361) Вількепічэ вепраўскай вол., 362) Вількендзе каварскай вол., 363) Вільканце рагоўскай вол., 364) Вількамір вількамірскага пав., 365) Вілкішкі сядзкай вол., 366) Вілкі, 367) Вілкі, 367-а) Вілкокі гадонаўскай вол., 368) Вілкі ольсядзкай вол., 369) Вілкамішкі ворненскай вол., 370) Вілкайце бэрнатоўскай вол., цельшэўскага пав., 371) Вількішкі пнеўскай вол., 372) Вількіня гульбінскай вол., 373) Вількіня падбіржанскай вол., 374) Вількія кракіноўскай вол., 375) Вількіня нацюнскай вол., 376) Вількішкі I, 377) Вількішкі II пампянскай вол., 378) Вількіня разалінскай вол., 379) Вількелі новамескай вол., 380) Вількалоўка пампянскай вол., 381) Вілковін кракіноўскай вол., 382) Вілкагіры скрабатыскай вол., 383) Вілкоп'ева пнеўскай вол., 384) Вількішкі пампянскай вол., 385) Вількішкі пампянскай вол., 386) Вількішкі таўрогенскай вол. панявескага пав., 387) Вількіня падубіскай вол., 388) Вількалі жагорскай вол., 389) Вількайці крупеўскай вол., 390) Вількіце-Рахвяны жагорскай вол., 391) Вількішкі, 392) Вількішкі падубіскай вол., 393) Вількішкі куршанскай вол., 394) Вількура, 395) Вілкдобэ шаўлянскай вол., 396) Вількалі жагорскай вол. шавельскага пав., 397) Вількеле, 398) Вількі панядзельскай вол., 399) Вількішкі тыльтыскай вол., 400) Вількішкі таўрогенскаи вол., 401) Вількішкі салокскай вол., 402) Вілкале чадоскай вол., 403) Вілкагір панядзельскай вол., 404) Вілкадобе відзкай вол., 405) Вілкажэры смолвенскай вол., 406) Вілкоці рымшанскай вол. нова-аляксандраўскага пав.

Побач з такім вялікім лікам назваў паселішчаў на вывучаемай мной тэрыторыі ёсьць вельмі многа назваў іншых географічных об'ектаў з асноваю воўк:—407) р. Вількавія ваўкавыскага пав., сувалскай губ., 408) воз. Вількаўскае сейнінскага пав. сувалскай губ., 409) р. Волкуш аўгустоўскага пав. сувалскай губ., 410) р. Вількамір вількамірскага пав. ковенскай губ., 411) воз. Вілкошня троцкага пав. віленскай губ., 412) р. Вількінца, 413) воз. Воўчын віленскай губ., 414) р. Вільк прытока Ёгэ прытокі Нёмну, 415) р. Воўча, левая прытока Самару прытокі Дняпра, 416) р. Вільча, прытока Рыся, аднэй з прытокі Ушы, што цячэ ў Прыпяць, 417) воз. Воўча віцебскай губ., 418) р. Воўча прытока Ушачы, 419) р. Ваўката прытока Дзьвіны, 420) р. Воўкавыя, прытока Росі, прытокі Нёмну, 421) р. Вельквідзіс прытока Мушы прытокі Аа, 422) р. Вількія прытока Шветы прытокі Аа, 423) р. Воўк прытокі Сулы прытока Нёмну, 424) р. Воўкуш прытока Чор. Ганьчы прытокі Нёмну, 425) Воўкалацкае балота вялейскага пав. віленскай губ., 426) р. Воўчы Роў прытока Маладой прытокі Убарці, 427) р. Воўчанка прытока Бярозы вышэй Бабруйску, 428) р. Воўка прытока Морачы прытокі Случы, 429) воз. Вількалі троцкага пав., 430) воз. Вількашнэ троцкага пав. і інш. [154]).

Апрача ўсіх памянёных паселішчаў і іншых географічных об'ектаў, паведамленьні на анкету выявілі існаваньне назваў з асноваю воўк — у наступных раёнах БССР: I аршанская акруга: а) амсьціслаўкі раён: 431) Ваўкі—частка вёскі Бязводзічы мазлаўскага сс., 432) Ваўкі—частка вёскі Тураўкі, 433) Воўкаўка, 434) Ваўкі мазлаўскага сс., 435) Курганы Ваўкі ля Добрае лапацінскага сс., 436) Воўчы Лес лапацінскага сс., 431) ур. Воўкаперабежышча ля в. Кудрычы рылаўшчынскага сс., 438) ба-

лота Воўкарэзнае ля м. Пацкава курманаўскага сс., 439) яма Ваўкаўня ля в. Гараны пацолтаўскага сс., 440) Воўкава гара ля Нашкавіч старсельскага сс., 441) ур. Воўчае Ляда ля Занькаўшчыны пацолтаўскага сс.; б) багушэўскі раён: 442) ур. Ваўкаўня ля Новага Сяла навасельскага сс.; в) дрыбінскі раён: 443) Ваўкалакі, 444) ур. Ваўкаўня каля Галалобаўкі пакуцкага сс.; г) капыскі раён: 445) ур. Воўчы лес у лесе Дзяньгуба Клінаславенскага сс., 446) Воўкаў лес ля Падкняжаньня аляксандраўскага сс., 447) паляна Ваўчкоў круг ля в. Застружжа дубраўскага сс., д) коханаўскі раён: 448) ур. Ваўкаўня ля в. Хаценічы Сіманоўскага сс. 449) ур. Ваўкаўня ля в. Падбярэзьзя сіманаўскага сс., 450) Воўчае балота ля Пярэўлачні пярэўлачнянскага сс., 451) ур. Ваўкаўня ля Высокага коханаўскага сс., 452) Воўчы квартал і 453) Воўчыя ямы ў смалянскай лясной дачы, 454) Воўкаў роў, 455) Воўкава балота ля сельск. гасп. т-ва „Волга" пярэвалачнянсканa сс., 456) ур. Ваўкаўня ў абходзе № 15 голашаўскай лясной дачы, 457) ур. Ваўкаўня ля Дуброўскіх сіманоўскага сс.; е) круглянскі раён: 458) ур. Ваўкаўня ля в. Рачча; ж) крупскі раён: 459) ур. Ваўчок ля Краснаўкі сакаловіцкага сс., з) ляднянскі раён: 460) ур. Воўкавы рэзы ля Кабыльля, 461) Воўкаў роў ля іскаскага сс., 462) ур. Воўкаўшчына ля Батураўшчыны; і) расонскі раён: 463) ур. Ваўкаўня ля ст. Цёмны лес рубцоўскага сс., 464) Воўкава балота ля Башар пячонкаўскага сс., 465) ур. Ваўкаўня ля в. Дубраўкі рубцоўскага сс., 466) р. Воўчыс, 467) ур. Воўкаў вугал ля Забалацьця, 468) ур. Воўчышча забалацкага сс., й) талачынскі раён: 469) балота Ваўкі ля Анілева саколінскага сс., 470) балота Ваўкаўня ля Равяцічы скалінскага сс.; к) чарэйскі раён: 471) ур. Воўчкавічы абчускага сс., 472) Воўчае балота ля Лукамля; II бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 473) лес Воўчае вуха ля Старонкі карытнянскага сс., 474) ур. Падворчае ля в. Панкратавіч; б) бабруйскі раён: 475) р. Ваўчынка, 476) х. Воўчая яма рымавецкага сс., 477) лес Ваўкаўня броскага сс., 478) ур. Ваўкаўня ля Чарніцы сычкаўскага сс., 479) Воўчая палянка тамсама, 480) Ваўкаўня асаўскога. сс., 481) х. Воўчынка сычкаўскага сс., 482) ур. Воўкава валока ясенскага сс., 482) ур. Воўчыя ямы ясенскага сс., 483) Воўчая гара міхалеўскага сс., 484) Воўчае балота ля Рыні міхалеўскага сс., 485) ур. Ваўкаўня ля Падрэчча падрэцкага сс., 486) Воўчая гара ля Дваранінавіч паплавіцкага сс., 487) Воўчае балота цялускага сс.; в) глускі раён: 488) ур. Ваўчкі гарадоцкага сс., 489) ур. Ваўкаўня казловіцкага сс., 490) Воўчая яма ля Гарадка гарадоцкага сс.; г) жлобінскі раён: 491) ур. Воўчае ляда ля ст. Рудні руднянскага сс., 492) х. Ваўчок ля Піравіч, 493) ур. Воўчы дуб ля Радушы радускага сс., 494) ур. Воўчая яма ля Рудні казіміраўскага сс.; д) клічаўскі раён: 495) ур. Воўчае горла ля Берды ваевіцкага сс., 496) ур. Воўчае балотца ля Рачэні рачэньскага сс.; е) парыцкі раён: 497) ур. Воўкаў мох ля Трэмлі парыцкага сс., 498) ур. Ваўкаўня ля Рухалеўшчыны крукаўскага лясьніцтва, 499) ур. Воўчае горла на рэчцы ля Сьцяны, 500) ур. Воўкаўшчына ля Дубровы, ж) рагачоўскі раён: 501) ур. Воўчае балота, 502) воз. Ваўканель ля Ліскоў пабалаўскага сс., 503) лес Воўкаў там сама; з) слуцкі раён: 504) ур. Ваўчкі ля Мялешкавіч мялешкавіцкага сс., 505) ур. Ваўкаўня ісерскага сс.; і) старадарoскі раён: 506) х. Воўчычы, 507) пас. Воўчая гара пасецкага сс.; к) старобінскі раён: 508) ур. Воўчае ля Даманавіч, 509) ур. Воўчы Астравок ля Паварчыц, 510), ур. Ваўчкі ля Задражава мазурскага сс., 511) ур. Воўчыя норы ля Зажэвіч зажэвіцкага сс., 512) ур. Воўкава яма ля Цясова пагоскага сс.; л) сьвіслацкі раён: 513) ур. Ваўкаўня ля Люціна віркаўскага сс.; м) чырвона-слабодзкі раён: 514) Воўчая сьцежка ля Малышавіч малышавіцкага сс.; III віцебская акруга: а) азя-

рышчанскі раён: 515) ур. Ваўчкі ля Ключа асіпаўскага сс., 516) ур. Ваўчкі ля Ярыгіна асіпаўскага сс., 517) ур. Ваўкаўня ля Будніцы хвашнянскага сс., 518) ур. Воўкаў бярэзьнік ля Лухвераў пылькінскага сс.; б) бешанкавіцкі раён: 519) ур. Воўкаўшчына ля Полькавіч бешанкавіцкага сс., 520) ур. Воўкавы ямы ля Лугінавіч, 521) х. Воўкава; в) віцебскі раён: 522) ур. Воўчыя Пераходы ля Курыліна, 523) Воўчая яма ля Ярмолкава войтаўскага сс., 524) ур. Воўкава выгар ля Ваяводак рудакоўскага сс., 525) х. Ваўкі міхалёўскага сс.; г) высачанскі раён: 526) ур. Ваўчок ля Лабаноў кабыльніцкага сс., 527) ур. Воўчкавічы ля Зазыбаў кабыльніцкага сс.; 528) ур. Ваўкаўня ля Сьцепаненак; д) межанскі раён: 529) ур. Ваўкаўня ля Пліткаў вышадзкага сс., 530) Воўкавы ямы ля Борак гозьбінскага сс.; е) сіроцінскі раён: 531) ур. Ваўкарэзіна ля Слабодкі дабейскага сс., 532) Воўчая яма ля Сіроціна, 533) ур. Воўчкава балота ля Варанькоў лаўжанскага сс., 534) Воўчая гара там сама; ж) сураскі раён: 535) ур. Ваўкі ля Задзетунія навіцкага сс.; з) чашніцкі раён: 536) ур. Воўчая яма ля Жэрына лазуноўскага сс.; IV гомельская акруга: а) гомельскі раён: 537) ур. Ваўкаўня каля Валатовіч; в) лоеўскі раён: 538) ур. Ваўкаўня каля Ваўкашанкі, 539) Воўчая гара ля Дзімамеркі; б) рэчыцкі раён: 540) ур. Воўчы шынок ля Васілевіч, 541) ур. Ваўчкі ля Васілевіч, 542) Воўчая гара ля Крапіўні, 543) ур. Воўчы Гарадок ля Шалковіч, 544) Воўчая гара ля Васілевіч, 545) поле Ваўчыха там сама, 546) ур. Воўчыя сьцежкі ля Васілевіч, 547) ур. Воўчая Даліна ля Дзеражкі, 548) Ваўчагурскі шлях; в) уваравіцкі раён: 549) ур. Воўчае балота ля Варашылава, 550) ур. Воўчая перабежка ля Варашылава, 551) курган Ваўчок ля Краснай Хачэмлі гусявіцкага сс., 552) ур. Воўчае балота ля Чабатовіч, 553) ур. Воўкаў рог ля Альхоўкі, 554) ур. Ваўкаўня ля Троцкай; г) хойніцкі раён: 555) Воўчы корч ля Храпкоў, 556) Воўчая гара там сама; д) чачэрскі раён: 557) ур. Ваўкаўня ля глыбочацкага сс., 558) ігруша Ваўчок у Глыбочыцах глыбочыцкага сс.; V магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 559) ур. Ваўкі ля хут. Кіпялёвых ля в. Мамачын, 560) Воўчае балота ля Зарэчча глускага сс., 561) ур. Воўчая грыва ля Мамачына чырвона-асавецкага сс.; б) кармянскі раён: 562) ур. Воўчы борык ля Кляпінскай буды валынскага сс., 563) ур. Ваўкаўня ля Кароцькаў; в) касьцюковіцкі раён: 564) ур. Ваўкаўня ля Студзянца, 565) Воўкаў хутар царковіцкага сс., 566) Восаў пячарскага сс.,



Картаграма назваў геаграфічных об'ектаў з асноваю воўк паводле даных экспэдыцыі і анкеты 1928 г. [без паказаных у папярэдняй].

567) Бальшая крапіўка бялынкавіцкага сс.; г) клімавіцкі раён: 568) Ваўчыная гара дубровіцкага сс., 569) ур. Воўчы волак ля Рудні гразявецкага сс., 570) Воўчае балота ля Гразяўца 571) Ваўкарэзаў лес аўтухоўскага сс., 572) р. Ваўчэц; д) краснапольскі раён: 573) ур. Воўчы лог ля Кармы новаельненскага сс.; е) крычаўскі раён: 574) лагчына Ваўкарэзава ля Залесавіч; ж) лупалаўскі раён: 575) ур. Ваўкаўня ля Кадзіна алехініцкага сс., 576) балота Ваўкі ля Старой Мілееўкі махаўскага сс., 577) ур. Драздова Ваўкаўня ля Косьценкі махаўскага сс., 578) Воўчкава балота ля Сухароў; 579) р. Ваўчок, 580) ур. Ваўкаўня ля Дарэю тараноўскага сс., 581) Воўкаў лес ля Нова-Мілееўкі слабадзкога сс., 582) Воўчае балота ля Красьніцы грудзеўскага сс., 583) ур. Ваўкаўня ля Дабужаў трылесенскага сс., 584) ур. Воўчае балота ля Сухароў сухароўскага сс.; з) магілеўскі раён: 585) ур. Воўчы лог ля Палыкавіч палыкавіцкага сс.; і) хоцімскі раён: 586) ур. Ваўкі ля андронаўкі ельненскага сс.; 587) ур. Воўчын стог ля Вялікай Ліпаўкі, 588) балота Воўчае стойбішча там сама, 589) балота Ваўкаўня — тамсама, 590) Воўкава балота ля Ціханкі 1 арлоўскага сс.; к) чачэвіцкі раён: 591) ур. Ваўкаўня ля Колбава чыгірынскага сс.; л) чэрыкаўскі раён: 592) Воўкава гара ў Чэрыкаве, 593) р. Воўчас, 594) в. Воўчас, 595) ур. Воўчы куст ля Глінёў глінскага сс., 596) ур. Воўчыя лагі — там сама, 597) ур. Ваўчарня губішчынскага сс., 598) в. Воўчаборкі, 599) Воўкава балота ля Шароеўкі; VI мазырская акруга: а) азарыцкі раён: 600) ур. Ваўкаўня савіцкага сс.; б) калінкавіцкі раён: 601) ур. Ваўкаўня ля Пеніцы гулевіцкага сс.; в) капаткевіцкі раён: 602) ур. Воўкава, 603) ур. Воўчы бор, 604) Воўчы брод, 605) Воўчы перагон, 606) ур. Ваўкаўня; г) каралінскі раён: 607) х. Воўчае; д) лельчыцкі раён: 608) Воўчы лес буйнаўскага сс., 609) Воўчае балота, 610) Воўчая горка грабянёўскага сс.; е) нараўлянскі раён: 611) Воўчае балота; ж) юравіцкі раён: 612) ур. Воўчая нізіна ля Алексіч, 613) ур. Воўчы круг тамсама, 614) ур. Воўчы лес ля Ужынца, 615) ур. Ваўкаўня тамсама; VII менская акруга: а) астрашыцка-гарадзецкі раён: 616) ур. Воўкаўшчына ля Мачаноў беларуцкага сс.; б) барысаўскі раён: 617) ур. Ваўкацеча ля Брылёва касьцюкоўскага сс., 618) ур. Воўчая гара забашаўскага сс.; в) бягомльскі раён: 619) ур. Воўчая выскака кадлубішчанскага сс., 620) ур. Ваўкаўня ля Дамашкавіч асаўскога сс., 621) ур. Воўчык, 622) ур. Воўк ля Біруляў глінскага сс., 623) ур. Воўк ля Глінага глінскага сс.; г) вузьдзенскі раён: 624) ур. Воўчы хвост, 625) ур. Воўчы куток, 626) ур. Воўчы амшар, 626) ур. Ваўкаўня целякоўскага сс., 627) ур. Воўчае горла, 628) р. Воўкаўка; д) грэскі раён: 629) Воўчая грэбля ля Вераб'ёва, 630) ур. Ваўкаўня ля Леніна першамайскага сс.; е) заслаўскі раён: 631) в. Воўкаўшчына новадворскага сс., 632) ур. Воўчы луг ля Ламшына слабадзкога сс., 633) ур. Воўчы лог бараздынскага сс., 634) Воўкаў лес каля Воўкаўшчыны, 635) Воўчая яма каля Казекава, 636) Воўчае балота ля Засьценка гатавінскага сс., 637) Ваўкаўня у Лабэншчыне слабодзкага сс., 638) Воўчае балота ля Слабады слабодзкага сс., 639) ур. Ваўкаўня ля Гуёў новадворскага сс., 640) ур. Воўчае балота ля Каўшова; ж) капыльскі раён: 641) ур. Воўчае балота ля Каласаўшчыны, 642) частка Пясочка — Воўчы хвост, 643) ур. Падвоўк ля Лоцьвін бабоўскага сс.; з) лагойскі раён: 644) ур. Ваўкаўня б. багатырскі склеп ля Рудні, 645) Воўкава балота коранскага сс.; і) пухавіцкі раён: 646) х. Воўчы вугал, 647) ур. Ваўкаўня, 648) Воўчы камень, 649) ур. Ваўкалоткі, 650) х. Ваўкаўня; к) самахвалавіцкі раён: 651) ур. Ваўкаўня самахвалавіцкага сс.; л) сьмілавіцкі раён: 652) ур. Ваўчкі ля Запольля карзуноўскага сс., 653) Ваўчкоўская вуліца ў Сьмілавічах, 654) Ваўчкоўская дарога, 655) ур. Ваўкачэчына дукорскага сс., 656) поле Ваўкі карзуноўскага сс., 657) зас. Воўкач,

658) балота Ваўчкі карзуноўскага сс.; м) чэрвенскі раён: 659) ур. Ваўкаўшчына хутарскага сс., 660) Воўчая горка ля Кублішча раваніцкага сс., 661) ур. Воўчая града ля Каранеўшчыны, 662) ур. Воўчы востраў ля Вясёлай Горкі турынскага сс., 663) ур. Воўкаўня руднянскага сс., VIII полацкая акруга: а) валынецкі раён: 664) ур. Воўчыя ямы ля Засьвяцьця кушлікоўскага сс., 665) ур. Ваўчкі ля Вадхвалева прудзінаўска сс.; б) ветрынскі раён: 666) х. Ваўчкова, 667) лясная дача Ваўчкова, 668) в. Ваўчкова, 669) ур. Ваўкаўня ля Турца II; в) дрысенскі раён: 670) ур. Воўкава плянтоўка жаўнянскага сс., г) лепельскі раён: 671) ур. Воўчы горад лепельскага сс., 672) ур. Воўчая яма лепельскага сс.; д) полацкі раён: 673) ур. Ваўчкі булаўскага сс., 674) х. Воўчыя ямы булаўскага сс., 675) ур. Ваўчыныя горы юравіцкага сс.; е) расонскі раён: 676) в. Ваўкі, 677) ур. Ваўкаедзь альбрэхтаўскага сс., 678) лес Воўчыя ямы дворыскага сс., IX—з-замеж БССР: 679) в. Воўкава прыдруйскай вол. дзьвінскага пав.[41]).

Супроць 430 назваў геаграфічных об'ектаў з асноваю воўк,—вядомых з ранейшай літаратуры, мне ўдалося выявіць толькі 248 новых назваў у БССР. Але іх ёсьць, бясспрэчна, значна больш; рэгістраваньне такіх назваў было заданьнем труднейшым уласна з прычыны вялікай колькасьці іх. Дзякуючы большай непаўнаце матар'ялаў, чым гэта было ў выпадках з назвамі з асновай волат—і коранем лют—, колькасьць назваў геаграфічных об'ектаў з асноваю воўк—меншая на адзін сучасны раён, чым колькасьць гэтых назваў, вядомых з ранейшай літаратуры, на адзін ранейшы павет.

Прозьвішчы і мянушкі: Ваўкарэзаў, Ваўчкаў, Ваўчок, Воўк, Ваўчыха, Ваўчонак, Ваўчкаў, Ваўчароў, Ваўковіч, Ваўкалака, Ваўчэўка, Ваўкун, Ваўкінаў, Вільчынскі, Ваўкалакаў і д. т. п. згодна паведамленьняў на анкету ёсьць у наступных паселішчах БССР., або ў іх ваколіцах: 1 аршанская акруга: а) амсьціслаўскі раён: 1) Бязводзічы мазлаўскага сс.; 2) Касмынічы хлышчэўскага сс.; 3) Балакіры лапацінскага сс.; 4) Амсьціслаў; 5) Тураўка; 6) Добрае лапацінскага сс.; 7) Шамава; 8) Сапалава мазлаўскага сс.; 9) Хлышчэва хлышчэўскага сс.; 10) Навасёлкі старасельскага сс.; 11) Гараны пацолтаўскага сс.; 12) Беразуйкі дудчыцкага сс.; б) багушэўскі раён: Станькі навасельскага сс.; 14) Багушэўскае; 15) Бяленіва сідарніцкага сс.; 16) Кемена какоўшчынскага сс.; в) дрыбінскі раён: 18) Ваўкавічы; 19) Карэбы карэбскага сс.; 20) Дрыбін; 21) Крукоўшчына гарадзецкага сс.; 22) Галалобаўка пакуцкага сс.; 23) Галабурды бельскага сс.; г) дубровенскі раён: 24) Дуброўна; д) капыльскі раён: 25) Уланава; 26) Калінаўка, 27) Хілцы, 28) Атраднае маслакоўскага сс.; 29) Стрыкілі маслакоўскага сс.; 30) Застружжа дубраўскага сс.; е) коханаўскі раён: 31) Пярэўлачня пярэўлачнянскага сс.; 32) Водвічы тумлянскага сс.; 33) Высокае коханаўскага сс.; 34) Астрагі аленавіцкага сс.; 35) Волга пярэвалачнянскага сс.; 36) Пабрашынічы шабекскага сс.; 37) Межнева аленавіцкага сс.; ж) круглянскі раён: 38) Рачча; 39) Ахімкавічы 1 каменіцкага сс.; з) ляднянскі раён: 40) Кабыльле; 41) Страхі, 42) Ліцьвінава, 43) Іскозы іскоскага сс.; 44) Марчонкі, 45) Кроцікі, 46) Хвесяўка бельскага сс.; 47) Прогрэс ляднянскага сс.; 48) Янкаўшчына; і) расьянскі раён: 49) Дубраўка рубцоўскага сс., 50) Ракаўшчына пячонкаўскага сс.; 51) Забалацьце, 52) Дзедня дзеднеўскага сс.; 53) Умыркі пячонкаўскага сс.; 54) Картышы пячонкаўскага сс.; 55) Каменка рабцоўскага сс.; 56) Рабяшкі, 57) Забалацьце; й) талачынскі раён: 58) Талачын, 59) Варанцэвічы воўкавіцкага сс.; 60) Друцк друцкага сс.; 61) Сіўцова воўкаўскага сс.; 62) Яўлахі яўлахаўскага сс.; 63) Любонічы яўлахаўскага сс.; 64) Міхалаўшчына азярацкага сс.; 65) Трасьцянка ульянаўскага сс.; 66) Зайкаўшчына; к) чарэйскі раён: 67) Асечана

заборскага сс.; 68) Язбы дубаўскога сс.; 69) Чарэя, 70) Калодніца дубаўскога сс.; 71) Стайкі гілянскага сс.; 72) Бяляны заборскага сс.; 73) Белая Дуброва сьлідчанскага сс.; 74) Чараеўка заборскага сс.; II бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 75) Селішча, 76) Убалацьце карытнянскага сс.; б) бабруйскі раён: 77) Барбарава сычкаўскага сс.; 78) Лешчанка лешчанскага сс.; 79) Бортнікі бортнікаўскага сс.; 80) Рыня міхалеўскага сс.; 81) Мазараўка баравіцкага сс.; 82) Папоўшчына мышкавіцкага сс.; 83) Ступяні цялусскага сс.; 84) Сеяны хвойнік міхалеўскага сс.; 85) Ясны лес хімаўскага сс.; в) глускі раён: 86) Рудня карпілаўскага сс.; г) жлобінскі раён: 87) Завод чацьвернянскага сс.; 88) Піравічы, 89) Кругавец, 90) Нікольск піравіцкага сс.; 91) Баранаўка чацьвярнянскага сс.; д) клічаўскі раён: 92) Уладзімірава, 93) Запольле; е) парыцкі раён: 94) Трэмля любаньскага сс.; 95) Паганцы ракшынскага сс.; ж) рагачоўскі раён: 96) Лучын, 97) Красьніца, 98) Новы дварэцкага сс.; з) слуцкі раён: 99) Квасьніцы цараўскага сс.; 100) Слуцак, 101) Панічы дарасінскага сс.; 102) Цараўцы цараўскага сс.; 103) Балотчыцы беліцкага сс.; 104) Кляпчаны; і) старобінскі раён: 105) Узброд чапялёўскага сс.; 106) Круглы востраў старобінскага сс.; 107) Крывічы краснадворскага сс.; 108) Задражава мазурскага сс.; 109) Цясоў пагосцкага сс.; 110) Зажэвічы зажэвіцкага сс.; 111) Мяцявічы мяцявіцкага сс.; 112) Сяльцо мяцявіцкага сс.; 113) Пагост пагосцкага сс.; 114) Галіца зажэвіцкага сс.; 115) Пагост пагосцкага сс.; й) чырвона-слабодзкі раён: 116) Заўшычы старчыцкага сс.; 117) Бялевічы; III віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 118) Быкі мехаўскага сс.; 119) Будніца хвашнянскага сс.; 120) Лухверы пылькінскага сс.; 121) Альшанікі пылькінскага сс.; 122) Горкі горкаўскага сс.; 123) Марозава мехаўскага сс.; б) бешанкавіцкі раён: 124) Любічы навікоўскага сс.; 125) Сьвіціна чаркаскага сс.; 126) Семянцова біклоскага сс.; 127) Забор'е біклоскага сс.; 128) Бешанкавічы, 129) Сьвярдлы навікоўскага сс.; 130) Сьвеча сьвячанскага сс.; в) віцебскі раён: 131) Пятровішча даўжанскага сс.; 132) Лосьвіда, 133) Асеча, 134) Старое сяло старасельскага сс.; 135) Путы сініцкага сс.; 136) Ваўкі міхалеўскага сс.; 137) Замосьце заронаўскага сс.; 138) Жалезьніца 1 старасельскага сс.; г) высачанскі раён: 139) Вялідзічы, 140) Шаўкунова, 141) Юшкава асінаўскага сс.; 142) Чаркасы высачанскага сс.; 143) Старабабыльле старабабыльскага сс.; 144) Ардзеж касьцяёўскага сс.; 145) Буракі высачанскага сс.; 146) Сьцепаненкі, 147) Кавалёва каралёўскага сс.; д) гарадоцкі раён: 148) Шыкяні селішчанскага сс.; 149) Ваўкі вайханскага сс.; 150) Дрыжакі казьянскага сс.; 151) Трацякі вайханскага сс.; 152) Вялікае Кашо маскаліняцкага сс.; 153) Забор'е ўладзіміраўскага сс.; 154) Гарадок, е) лёзьненскі раён: 155) Ляхавік 1 унаўскага сс.; 156) Васюціна веляшкаўскага сс.; 157) Сяргееўшчына гладаньскога сс.; 158) Строганы калышанскага сс.; 159) Гладанькі гладаньскога сс.; 160) Селішча гладаньскога сс.; 161) Веляшковічы веляшковіцкага сс.; ж) межанскі раён: 162) Фралова вышадзкога сс.; 163) Дарахі гозьбінскага сс.; 164) Боркі гозьбінскага сс.; 165) Халіпы гозьбінскага сс.; 166) Чаравуха межанскага сс.; 167) Папоўшчына, 168) Вышадкі вышадзкага сс.; з) сянскі раён: 169) Адамава алексініцкага сс.; 170) Машкі пустынскага сс.; 171) Зямковічы алексініцкага сс.; і) сіроцінскі раён: 172) Слабада ловаскага сс.; 173) Сіроціна, 174) Лоўжа лаўжанскага сс.; 175) Хойніца мішневіцкага сс.; 176) Варанькі лаўжанскага сс.; 177) Юрава лаўжанскага сс.; 178) Барысаўка жарабыцкага сс.; й) сураскі раён: 179) Шпуры янавіцкага сс.; 180) Малая Лазаватка краўцоўскага сс.; 181) Янавічы, 182) Задуброўе янавіцкага сс.; к) чашніцкі раён: 183) Іканкі дварэцкага сс.; 184) Шаўкоўшчына вялікаальшанскага сс.; IV гомельская акруга: а) брагінскі раён:

185) Собалі; б) буда-кашалёўскі раён: 186) Чырвоная Наспа, 187) Крапіўня, в) веткаўскі раён: 188) Жалезьнікі. г) гомельскі раён: 189) Гомель. д) лоеўскі раён: 190) Грамыкі, 191) Лясуны лоеўскага сс.; 192) Ваўкашанка, 193) Лоеў. е) рэчыцкі раён: 194) Васілевічы, 195) Ліскі, 196) Залатуха, 197) Новы Барсук, 198) Дзеражня, 199) Гарыводы, 200) Рудзец, 201) Холмеч, 202) Пракісельскі хутар, 203) Рэчыца, 204) Восаў, 205) Салтанаў; е) уваравіцкі раён: 206) Красная Хачэмля гусявіцкага сс.; 207) Чабатовічы, 208) Альхоўка, 209) Дуброва рудня целяшоўскага сс.; 210) Целяшы; ж) хойніцкі раён: 211) Пудакова паселіцкага сс.; 212) Загальская Слабодка, 213) Кастрычнікавае лясьніцтва, 214) Храпкоў. з) чачэрскі раён: 215) Зялёны мох заслаўскага сс.; V магілеўская акруга: а) быхаўскі раён: 216) Цюпоўская сяліба гарадзецкага с. с.; 217) Шмакі; 218) Пянюгі клятнянскага сс.; 219) Лудчыцы, лудчыцкага сс.; 220) Мокрае макранскага сс.; 221) Мамачын чырвона-асавецкага сс. 222) Давыдавічы чырвона-асавецкага сс.; б) бялыніцкі раён: 223) Замачульле; в) журавіцкі раён: 224) Старасельле бялыніцкага сс.; 225) Добры дуб баканьскага сс.; 226) Вялікая Зімніца, Палянінавічы; 227) Журавічы; г) кармянскі раён: 228) Багдановічы кароцькаўскага сс.; 229) Касыль руднянскага сс.; 230) Карма, 231) Кляпінская буда валынскага сс.; 232) Хізаў; г) касьцюковіцкі раён: 233) Студзянец; д) клімавіцкі раён: 234) Клімавічы, 235) Асмаловічы асмаловіцкага сс.; 236) Балешын, 237) Востраў лазавецкага сс.; 238) Асіньнікі ціманоўскага сс.; 239) Хатунь хатавіцкага сс.; 240) Пустышы, 241) Хвядотава буда галіцкага сс.; е) краснапольскі раён: 242) Карма навасельскага сс.; 243) Пачопы пачопаўскага сс.; 244) Хведараўка кажамякінскага сс.; ж) Крычаўскі раён: 245) Баяры кашанскага сс.; 246) Слабуты маляціцкага сс.; 247) Міткавічы маляціцкага сс.; 248) Шаеўка, 249) Крычаў; з) лупалаўскі раён: 250) Смолка хацкавіцкага сс.; 251) Лыкаў слабадзкога сс.; 252) Кадзіна алехініцкага сс.; 253) Хацкавічы I хацкавіцкага сс.; 254) Сідаравічы, 255) Дарэй тараноўскага сс.; 256) Машанакі машанацкага сс.; 257) Пусты Асавец махаўскага сс.; 258) Махаў махаўскага сс.; 259) Бязьчыньне хацкавіцкі сс.; 260) Ліпца махаўскага сс.; 261) Махава 7, махаўскага сс.; 262) Сухары сухараўскага сс.; і) магілеўскі раён: 263) Магілеў, 264) Палыкавічы палыкавіцкага сс.; 265) Княжыцы; й) прапойскі раён: 266) Прапойск, 267) Ржаўка; к) хоцімскі раён: 268) Хоцімск, 269) Захараўка ель-




Карта раёнаў, у якіх анкетай і экспэдыцыяй 1928 г. засьведчана бытаваньне прозьвішч з асновою воўк.

нянскага сс.; 270) Мужычок прасьцінскага сс.; 271) Ціханы I, арлоўскага сс.; 272) Н. Мосін чарняўскага сс.; л) чавускі раён: 273) Пятухоўка антонаўскага сс.; м) чачэвіцкі раён: 274) Збышын грыбавецкага сс.; 275) Стайка чыгірынскага сс.; 276) Шмакі падсельскага сс.; 277) Падсёлы падсельскага сс.; 278) Чачэвічы; н) чэрыкаўскі раён: 279) Вушакі, 280) Гарадок горкаўскага сс.; 281) Горкі горкаўскага сс., 282) Вудагі глінскага сс.; 283) Лабанаўка лабанаўскага сс.; 284) Шароеўка; VI мазырская акруга: а) азарыцкі раён: 285) Валасовічы валосавіцкага сс.; б) жыткавіцкі раён: 286) Жыткавічы, 287) Зорка; в) капаткевіцкі раён: 288) Капаткевічы; г) лельчыцкі раён: 289) Убарская Рудня астражанскага сс.; 290) Турбінка, 291) Жмурная грабянеўскага сс.; д) петрыкаўскі раён: 292) Белкі, 293) Петрыкаў, 294) Капкавічы, 295) Навасёлкі белкаўскага сс. е) юравіцкі раён: 296) Алексічы, 297) Ужынец; VII менская акруга: а) астрашыцка-гарадзецкі раён: 298) Чудзінічы астрашыцкага сс.; 299) Каз. Рудня прылепскага сс.; 300) Беларучы беларуцкага сс.; б) барысаўскі раён: 301) Барысаў, 302) Карсаковічы карсаковіцкага сс.; 303) Брылёў касьцюкоўскага сс.; 304) Убарак мсьціскага сс.; 305) Углы, 306) Лазін лабашаўскага сс.; 307) Воўкаўшчына каршакоўскага сс.; 308) Смаркі веляціцкага сс.; 309) Задор'е бярозкаўскага сс.; в) вузьдзенскі раён: 310) Галавачы магілянскага сс.; 311) Ялаўка целякоўскага сс.; 312) Сеяцель прысыпскага сс.; 313) Узда, 314) Хароміцкія сл. — пырашаўскага сс.; 315) Чэшын - Слабада каменіцкага сс,. 316) Баравыя лашанскага сс.; 317) Падзельнік, 318) Чашын, 319) Чэшынскі востраў камянецкага сс.; 320) Сыманчыцы; г) грэскі раён: 321) Астравок грэскага сс.; 322) Пукаў пукаўскага сс.: д) заслаўскі раён: 323) Мацкі слабадзкога сс.; 324) Хмелеўка акусінскага сс.; 325) Заслаўе, 326) Грыні, 327) Затычына барздынскага сс.; 328) Казекава гатавінскага сс.; 329) Саламарэчча гатавінскага сс.; 330) Закаблукі старасельскага сс.; 331) Чырвоны Кастрычнік старасельскага сс. 332) Лабэншчына слабадзкога сс.; 333) Келькаўшчына, 334) Навашына ганусінскага сс.; е) капыльскі раён: 335) Капыль, 336) Макрэц вялешынскага сс.; 337) Блеўчыцы быстрыцкага сс.; 338) Аношкі, 339) Якусоўшчына, 340) Заракаўкі браткаўскага сс.; 341) Сьвінка; ж) лагойскі раён: 342) Н. Родзевічы слабадзкога сс.; 343) Гасьцілавічы лагойскага сс.; 344) Аўгустова падонкаўскага сс.; 345) Міхалкавічы коранскага сс.; 346) Порхава падонкаўскага сс.; 347) Моладзі чоркаўскага сс.; з) пухавіцкі раён: 348) Сіротка блонскага сс.; 349) Блонь; і) Самахвалавіцкі раён: 350) Пяцеўшчына самахвалавіцкага сс. 351) Чайкава самахвалавіцкага сс., 352) Набалыцьце падгайскага сс. 353) племгас Калініна, 354) Прылукі, 355) Самахвалавічы, 356) Воўчкавічы; й) смалявіцкі раён: 357) Асавіна верхменскага сс.; 358) Восава плісскага сс.; к) сьмілавіцкі раён: 359) Запольле карзуноўскага сс.; 360) Карзуны карзуноўскага сс.; 361) Харавічы дукорскага сс.; 362) Гудавічы карзуноўскага сс.; 363) Сьмілавічы, 364) Старына карзуноўскага сс.; л) чэрвенскі раён: 365) Слатвіно, 366) Раванічы, 367) Красная слабада лядзенскага сс.; 368) Кляньнік верхменскага сс.; VIII полацкая акруга: а) асьвейскі раён: 369) Вільканы задзяжанскага сс.; 370) Царкоўка, 371) Кастрова б) валынецкі раён: 372) Лявонішана юзафоўскага сс.; в) ветрынскі раён: 373) Кеўлена Лагавая нацкага сс.; 374) Падсадзьдзе шпакоўскага сс.; 375) Арэхаўка нацкага сс.; 376) Лабуноўшчына варонецка сс.; 377) Варонечы варонецкага сс.; 378) Зазер'е гарадоцкага сс.; 379) Троцкае ліцьвінаўскага сс.; 380) Бязьдзедавічы ліцьвінаўскага сс.; 381) Пяцюлёва ветрынскага сс;. г) вульскі раён: 382) Крупеніна. д) дрысенскі раён: 383) Матулёва, 384) Патрабова цястаўскага сс.; 385) Дрыса; е) лепельскі раён: 386) Пахомлівічы ляхавіцкага сс.; 387) Беляўка ляхавіцкага сс., 388) Пушча

весялоўскага сс.; 389) Лепель, 390) Ст. Валосавічы, 391) Альховічы пышнянскага сс.; 392) Цясны валасовіцкага сс.; ж) полацкі раён: 393) Малыя Жарцы сястронскага сс.; 394) Дахнары булаўскага сс.; 395) Стрыкялі громаўскага сс.; 396) Юравічы юравіцкага сс.; 397) Еўніна саланіцкага сс.; 398) Замкі юравіцкага сс.; 399) Студзяная юравіцкага сс.; 400) Калатоўкі, 401) Лагуны громаўскага сс.; 402) Чорнае юравіцкага сс.; 403) Залесьсе юравіцкага сс.; з) расонскі раён: 404) Сітнякі красноборскага сс. 405) Булыніна старадворскага сс.; 406) Запрудзьдзе гарбачэўскага сс.; 407) Межава зьмітраўскага сс.; 408) Масткі гарбачэўскага сс.; 409) Альбрэхтава альбрэхтаўскага сс.; 410) Чарэкаўка дворынскага сс.; 411) Тукалава 412) Воў-




Картаграма паселішчаў па Нёмну, Дзьвіне, Дняпру і Прыпяці і на ўсход ад іх з асноваю воўк — у назьве.

кава; IX з-за меж БССР. 413) Вял. Баяры андрэненскай вол. дзьвінскага пав., 415) Цыканы Краслаўскае вол. дзьвінскага пав.[41]).

Зразумела, што частка назваў з асноваю воўк — можа быць вытлумачана наяўнасьцю воўка на вывучаемай мной тэрыторыі і адлюстраваньнем яго існаваньня тутака ў назвах геаграфічных об'ектаў і людзей. Але гэтая частка ня можа быць шматлічнай, як і групы іншых назваў, што адлюстроўваюць тыя або іншыя элемэнты мясцовага краявіду [162]). Гэта даводзіцца параўнаньнем колькасьці назваў паселішчаў з асноваю воўк у б. губэрнях на вывучаемай мной тэрыторыі і ў іншых б. губэрнях б. Расіі. Так у ленінградзкай губ.—10 такіх назваў, у пскоўскай—45, смаленскай—45, цьвярской—25, маскоўскай—9, уладзімірскай — 12, Яраслаўскай—18, кастрамской—26 [163]), калускай—10, Арлоўскай—13, курскай —8, тульскай—7, разанскай — 9,

ніжагародзкай—12, пензенскай—3, тамбоўскай—11, варонескай —8, чарнігаўскай—8, палтаўскай—21, харкаўскай—15 [164]), віцебскай—64, смаленскай—51, менскай—44, ковенскай—71, магілеўскай—22, горадзенскай—27, сувалскай — 32, віленскай--99 [165]). Такім чынам пры амаль аднолькавых умовах існаваньня воўка ў паказаных губэрнях, найбольшая колькасьць паселішчаў з асноваю воўк — у назьве, як гэта зафіксавана ў адпаведнай картаграме [166]), прыходзіцца на губэрні па Нёмну, Дзьвіне, верхавінах Дняпра і Прыпяці і суседніх з імі. А гэта якраз сьведчыць аб тым, што большую частку назваў з асноваю воўк — можна аднесьці да перажыткаў існаваньня народу ваўкоў, тым больш, што прозьвішча — воўк у процівагу старажытным часам [167]) не ў асаблівай пашане, а захавалася іх на паказанай тэрыторы надзвычайна многа.

Але на тэрыторыі паміж Дняпром, Дзьвіной, Нёманам і Прыпяцьцю можна знайці ня толькі перажыткі народных назваў волатаў у называньні паселішчаў і прозьвішчаў, але і назвы паасобных пляменьняў волатаў, якія нам вядомы ўжо сярод заходніх волатаў.

Першае месца тут належыць велінцам або валынцам.. У назьве старога беларускага гораду Вільні вучоныя ўжо даўно шукалі сьлядоў існаіснаваньня волатаў [168]). І запраўды, Вільня стаяла з незапомных дагістастарычных часоў на рэчцы, якая ўжо ў пазьнейшыя старыя часы звалася Веля, Велія, Велья, Веля, Вѣлья, Velya, Vielya, Wella і д. т. п., а горад на ёй — Вельня, Велѣнскае места, горад Велѣнскиі і д. т. п. [169]), які і зьяўляўся, мабыць, сталіцаю, як відаць, найбольшага племені волатаўвелінцаў. Адпаведна гэтаму была і Велъская, Завеленская, Завелская, Zawelska, Zawielskaja зямля і нават Велкомир [170]). Наогул назва велінцаў спатыкаецца ў старасьвецкіх докумэнтах даволі часта, называючы то географічныя об'екты: Валынцы, Велена, р. Воленка, р. Валынка, Вялёнская вол., Валынцава, Велюны, Веленская, Велюнская, Велюты, Валенская, Велюнская, Велюты, Валынская закута, веленскае ваявоздтва, р. Велья, веленскі пав., Вельнікі і д. т. п. [171]), то прозьвішчы людзей: Волініцкая, Валынец, Велін, Валынцэвіч, Валынчук і д. т. п. [172]). Па вестках даведачнай і апісальнай літаратуры [154]) можна лічыць, што перажыткі назвы племя велінцаў засталіся ў шэрагу назваў рэк і вазёр: воз. Велест б. парэцкага пав. б. смаленскай губ.; р. Вельніца б. клясьніцкай вол. б. дрысенскага пав. і р. Вельніца б. еўпрасіньеўскай вол. б. полацкага пав. б. віцебскай губ., воз. Дзьвіньне — Велінскае, з якога выцякае р. Дзьвіна, р. Веля правы прыток р. Усьвячы, прытоку Дзьвіны, р. Валынка прыток Дзьвіны; р. Воленка б. гомельскага пав.; р. Велья — левы прыток Гарыня, прытоку Прыпяці; воз. Вілянцы б. заблоціскай вол. б. сьвянцянскага пав., воз. Велец б. пліскай вол., б. дзісьненскага пав., воз. Велінве б. троцкага пав., воз. Вільнішкі б. гедройцкай вол. б. віленскага пав.; р. Вілія і г. д., а таксама — у шэрагу назваў паселішчаў: у ковенскай губ.: — Вілейкі, Вілейкі скемскай вол., Вілейкі крупеўскай вол.; Вілейкі паддубіскай вол. шавельскага пав.; Вельнякі стумбрынскай вол. панявескага пав.; Вілнокі, Велуны рымшанскай вол.; Вільнокі дукштанскай вол. нова-аляксандраўскага пав.; Валынія жмуйдзецкай вол. вількамірскага пав.; у віленскай губ. — вілянцы заблоціскай вол. сьвенцянскага пав.; Вілунцы кронскай вол.; Віляны, Віляны, Віляны жыжморскай вол.; Вілунцы езьнянскай вол.; Велунцы высокадворскай вол.; Валюнцы бутрыманскай вол. троцкага пав.; Валынцішкі седлецкай вол.; Вільнюці палянскай вол.; Веляўцы граўжынскай вол. ашмянскага пав.; Валынка жырмунскай вол. Лідзкага пав.; Велец пліскай вол.; Вільнава міорскай вол.; Вілянцеі ігуменаўскай вол.; Валынь верхнянскай вол. дзісненскага пав.; Валынішкі ільлінскай вол.;

Вільнішкі, Вільня — Вільнішкі, Вільнішкі гедройцкай вол.; Вілюцяны міцкунскай вол.; Вільное мейшагольскай вол.; Вільячы маляцкай вол.; Вілейкавічы, Вілейкавічы маляцкай вол.; Вільнішкі, Вільнішкі, Вільніцкі неменчынскай вол.; Вілейкішкі мусьніцскай вол.; Віленскае дзярэўніцтва, Віленскае дзярэўніцтва, Віленскае дзярэўніцтва, Віленскае дзярэўніцтва рашанскай вол. вілейскага пав.; у віцебскай губ. — Вільна тапорскай вол. нэвельскага пав.; Вельніца клясьціцкай вол. дрысенскага пав.; Велье, Велье узьнесенскай вол. полацкага пав.; Вялёны, Вялёны рэжыцкай вол. Вылнаўцы быкаўскай вол. рэжыцкага пав.; Вельніца афрасіньеўскай вол. полацкага пав. Валынцы, Валынцы філіпаўскай вол. дрысенскага пав.; Валынка начскай




Картаграма географічных назваў сугучных племянной назьве велінцаў.

вол.; Валынец бабыніцкай вол. лепельскага пав.; у магілеўскай губ. — Валынцы нова-ельненскай вол., Валымір Доўгавіцкай вол., чэрыкаўскага пав.; Валынкі доўскай вол. рагачэўскага пав.; Валынеж раднянскай вол. клімавіцкага пав.; Валынка старасельскай вол.; Веліна руднянскай вол. аршанцскага пав.; Вельня любавіцкай вол., Вельня, Вельня любавіцкай вол. мсьціслаўскага пав.; Вілейка, Вілейка чавускай вол. чавускага пав.; Валынка маркавіцкай вол. гомельскага пав.; Валынцава раманаўскай вол. горкаўскага пав.; Вілень чыгірынскай вол. быхаўскага пав.; Валынь добрамысьлянскай вол. аршанскага пав.; Велнава нова-быхаўскай вол. рагачэўскага пав.; у смаленскай губ. — Веліна смаленскага пав., Веліна юхнаўскага пав., Валынава і Валынцава духаўшчынскага пав.; Веляны, Веляны горныя парэцкага пав.; у менскай губ. — Нэвель, Нэвель хоінскай вол. пінскага пав.; Вільшчына станькаўскай вол. менскага пав.; Вялень навасёлкаўскай вол.; Вялень амельнянскай вол.; Вяленінік брадзецкай вол. ігуменскага пав.; Велем'е жыткавіцкай вол.; Веленічы хорскай вол. мазырскага пав.; Падвелье красналуцкай вол.; Веляўшчына валосавіцкай вол.; Вілейка,

Вілейка Новая вітуніцкай вол. барысаўскага пав.; Вільна сьвіслацкай вол.; Віленка качэрыцкай вол. бабруйскага пав.; Велін холмецкай вол., Велінскі перакат на Дняпры рэчыцкага пав.; у горадзенскай губ. — Валынцы круглянскай вол. сакольскага пав.; Велюнь зьбірогаўскай вол. кобрынскага пав.; Вілян алексінскай вол. бельскага пав.; у сувалскай губ.— Вілейкі сувалскага пав.; Валынцэ сувалскага пав. і інш. Быць можа да гэтых назваў яшчэ трэба было аднесьці і шмалічныя назвы паселішч і іншых географічных об'ектаў падобныя на іх, як Вяліж, Велішч і д. т. п. [173]).

Назва племяні сітнян знайшла сваё адлюстраваньне ў назвах вазёр: воз. Сіта ў б. ковенскай губ. і воз. Сітна, з якога выцякае р. Полата, а таксама ў шэрагу назваў паселішчаў: у віцебскай губ. — Сітнікі курынскай вол. віцебскага пав. Сітнягі вярхоўскай вол., Сітнікі сушчаўскай вол. дрысенскага пав., Сітніца ваяводаўскай вол. рэжыцкага пав., Сітнікі франапольскай вол., Сітнікі гутаўскай вол. лепельскага пав., Сіта балаўскай вол. люцінскага пав., Сітняні тапорскай вол., Сітаўка рыкшынскай вол. нэвельскага пав., Сіцянец юравіцкай вол., Сіцянец струнскай вол., Малое Сітно, Бальшое Сітно нікалаеўскай вол., Сітніца, Сітніца ўраўлянскай вол. полацкага пав., Сіціна горкаўскай вол., Сіціна вышадзкай вол., Сіта старынскай вол., гарадоцкага пав., Сіцькава, Сіцькава макланаўскай вол. вяліскага пав.; у менскай губ. — Сітнае старобінскай вол. слуцкага пав., Сітніча жыткавіцкай вол., Сітніца ленінскай вол., Сітня дзякавіцкай вол. мазырскага пав., Сітня дудзіцкай вол., Сіткаўшчына ручаеўскай вол. рэчыцкага пав., Сітнікі слабада-пырашэўскай вол., Сітнікі грабёнскай вол., Сітнікі кліноцкай вол. ігуменскага пав.; у смаленскай губ. — Сітнікі смаленскага пав., Сітнікі парэцкага пав. і Сіцкае юхноўскага пав.; у віленскай губ. — Сіцькава мікалаеўскай вол., Сіткаўшчына, Сіткаўшчына ёдзкай вол., Сітнікі друйскай вол. дзісьненскага пав., Сіткаўцы дубіцкай вол. лідзкага пав., Сітнік крайскай вол., Сітнікі даўгінаўскай вол., Сітца, Сітца Старое, Сітца Малое. Сітца новае парафіянаўскай вол. вялейскага пав., Сіцюны гедроіцкай вол. віленскага пав.; у магілеўскай губ. — Сітно, Сітно добрамысьлянскай вол., Сітава, Сітаўшчына, Сітаўскі засьценак любавіцкай вол., аршанскага пав.; у ковенскай губ. — Сіткуны, Сіткуны, Сіткуны бабтоўскай вол. ковенскага пав., Сітайны, Сітайны пампянскай вол., Сіткуны разалінскай, Сіткуны панявескай вол. панявескага пав.; у горадзенскай губ. — Сіткава, Сітаўка астрагорскай вол. сакольскага пав. і інш. [154]).

Племя ратараў нагадвае р. Ратнічанка, прыток Нёмана, ды наступныя паселішчы: у віленскай губ.— Рацькі глыбоцкай вол., Раткуны, Раткуны друйскай вол., Рацькі залескай вол., Рацькі, Рацькі ігуменаўскай вол., Рацькава празоракскай вол. дзісьненскага пав., Ратаголь Ратаголь, сольскай вол. ашмянскага пав.; у горадзенскай губ.—Ратайчыцы ратайчыцкай вол. брэскага пав., Ратавец чарнавескай вол. сакольскага пав. у ковенскай губ., — Раткуны, краснагорскай вол., Раткуны квяткоўскай вол. нова-аляксандраўскага пав., Рацелі стумбрыскай вол. Раценікі кібурскай вол., Раткуны кібурскай вол., Раткуны лінкаўскай вол. панявескага пав., Раткуны грузьдзёўскай вол. шавельскага пав.; у менскай губ. — Радчыцы вітчаўскай вол. пінскага пав., Ратынцы ракаўскай вол., Рацькаўшчызна беларуцкай вол. менскага пав., Ратчын шацкай вол., Раткаўшчызна верхнянскай вол., Ратнае юравіцкай вол. ігуменскага пав., Рацькавічы гайна-слабодзкай вол., барысаўскага пав., Раткава старобінскай вол., Раткава пацэйкаўскай вол. слуцкага пав.; у віцебскай губ.—Рацькава, Рацькава зябкінскай вол. нэвельскага пав., Рацькава, Рацькава усайскай вол. лепельскага пав., Рацькаўшчына вязьменскай вол. вяліскага пав., Ратава каменецкай вол. себескага пав., Раткаўшчына

начаскай вол. лепельскага пав., Ратанікі, Ратанікі узульмуйскай вол., Ратанікі розенмуйскай вол., Ратанікі, Ратанікі макашанскай вол. рэжыцкага пав.; у смаленскай губ. — Рацькава гжацкага пав., Ратуева духаўшчынскага пав., Ратаўскае рослаўскага пав., Ратава сычаўскага пав., Ратная бельскага пав., Ратнава, Ратнава смаленскага пав.; у магілеўскай губ. — Ратча глухаўскай вол. быхаўскага пав., Ратная, Бальшое Ратнае беліцкай вол. чэрыкаўскага пав. і інш. [154]).

Племянная назва ранаў спатыкаецца ў наступных назвах паселішчаў: у віцебскай губ.—Ранены, Ранены, Ранены каралёўскай вол. віцебскага пав., Ранцаны зальмуйжскай вол., Бальшыя Ранцаны, Малыя Ранцаны




Карта паветаў, у якіх засьведчана наяўнасьць геаграфічных назваў сугучных племянным назвам волатаў.

пылдзенскай вол. люцынскага пав., Ранчыцы бешанкавіцкай вол. лепельскага пав.; у менскай губ.—Раннае лошынскай вол. барысаўскага пав.; у ковенскай губ.—Ранюны янаўскай вол. ковенскага пав.; у горадзенскай губ.—Ране каменец-літоўскай вол. брэскага пав., Раневічы, Раневічы сьвіслацкай вол. ваўкавыскага пав. [154]); рачан—у назьве воз. Рачуны б. ашмянскага пав. б. віленскай губ. ды гэткіх паселішчаў: у менскай губ.—Рачанец, Рачанец, беларуцкай вол. менскага пав., Рачэнь забалацкай вол. бабруйскага пав., Рачное, Рачное тумілавіцкай вол. барысаўскага пав., Сьвентарачэна сёмкава-гарадзецкай вол. менскага пав.; у віленскай губ.—Рачаны сьвенцянскай вол. сьвенцянскага пав., Зарачаны салечніцкай вол,, Зарачаны, Зарачаны, Зарачаны рудамінскай вол. віленскага пав. і інш. [154]) укран—у назвах наступных паселішчаў: у ковенскай губ.—Украніка аванскай вол. вількамірскага пав., Укры, Укры жагорскай вол. шавельскага пав., Укрыны цельшаўскага пав.; у горадзенскай губ.—Укрынь дзярэчынскай вол. слонімскага пав.; у віленскай губ.—Некраны высокадворскай вол.

троцкага пав. [154]); марычан—у назьве ваз. Мерач і Мерач малы был. троцкага пав. б. віленскай губ., р. Мерачанка правы прыток Нёмана, ды быць можа, р. Мерча, левы прыток Анчы ды р. Моргач, правы прыток Шчары і воз. Мерскае б. дзісьненскага пав., а таксама ў назвах наступных паселішчаў: у віленскай губ.—Мерачы, Мерачы салечніцкай вол., Падмерач, Падмерач, Падмерач, Падмерач, Падмерач, Мерач-Вількішкі, Мерач, Мерач Міхнаўскі, Мерач-Юльянава ільлінскай вол., віленскага пав., Мерач мерацкай вол. Померач, Померач алькеніцкай вол., Померач аранскай вол. троцкага пав.; у віцебскай губ.—Марачыха чэрняцоўскай вол. нэвельскага пав.; у магілеўскай губ.—Мерч талпечыцкай вол. магілеўскага пав.; у менскай губ.—Морын усялюбскай вол., Марочна Бальшая марачанскай вол. Морачна Малая марачанскай вол., Мерчыцы парэцкай вол. Морачна марачанскай вол. пінскага пав., Морач ленінскай вол. мазырскага пав., Морач заастравецкай вол. слуцкага пав., Морчын навадароскай вол. бабруйскага пав., Мерчая грабёнскай вол. ігуменскага пав.; у горадзенскай губ.—Морачы пенюгоўскай вол. ваўкавыскага пав.; Марачэўшчына міхайлаўскай вол. пружанскага пав. і інш. [154]), церасьпенян—у назьве р. Піны прытоку Прыпяці, Пеннага балота мяжэвіцкай вол. слонімскага пав. горадзенскай губ., Пенявай магілы і назвах наступных паселішчаў: у менскай губ.—Пінск, Пінкавічы пінскага пав., Пенькавічы, Пенякі койданаўскай вол., Пенякі першайскай вол., Пеніна койданаўскай вол. менскага пав., Пінкавішча глівінскай вол. барысаўскага пав., Пеніца мазырскага пав., Пенявата старобінскай вол. слуцкага пав.; у віленскай губ.—Пеннае краснасельскай вол. віленскага пав.; у горадзенскай губ.—Пеняжкі масеўскай вол., Пеняжкі сухапольскай вол., Пеняны носкаўскай вол. пружанскага пав., Пінкавічы старавескай вол., Пінчыцы дзятлаўскай вол. слонімскага пав., Пенюга, Пенюга пянюгоўскай вол. ваўкавыскага пав. і інш. [154]); плонян—у назьве р. Плонянкі, левага прытоку Ісьліка на мяжы б. ковенскай і курляндзкай губ. і ў назвах паселішчаў: у смаленскай губ.—Блонье ў Смаленску; у магілеўскай губ.—Плоншчына замацкай вол. сянскога пав.; у менскай губ —Блонь докшыцкай вол., Блонь кішчына-слабодзкай вол. барысаўскага пав., Блонь, Блонь пухавіцкай вол. ігуменскага пав., Палонка нова-мыскай вол. Паланэчка, Паланэчка жукавіцкай вол. наваградзкага пав., Палоневічы койданаўскай вол. менскага пав., Полонная гарадзечанскай вол. наваградзкага пав., Палонеўшчына пухавіцкай вол. ігуменскага пав. у горадзенскай губ.—Паланец добрамысьлянскай вол., Палонск ружанскай вол., Палонск ружанскай вол., слонімскага пав., Плонава гарадзенскай вол. бельскага пав., і інш. [154]); хіжан і кішан—у назвах балота хіжа ў б. Аршанскім пав. б. магілеўскай губ. і наступных паселішчаў: у віленскай губ.—Кіжы, Кіжы гедроіцкай вол. віленскага пав.; Кішы плісай вол. дзісьненскага пав. у ковенскай губ.—Кежы кейданскай вол. ковенскага пав. і ў віцебскай губ.—Хіжа 1, Хіжа 2 гульцяеўскай вол. нэвельскага пав., Хіжы мікалаеўскай вол. полацкага пав., Хізава, Хізава станіславаўскай вол. лепельскага пав.; у магілеўскай губ.—Хізы, Хізы рэчкаўскай вол. гомельскага пав., Хізава, Хізаўская буда, Хізаў доўскай вол. рагачэўскага пав.; у менскай губ.—Кіжын карпавіцкай вол. рэчыцкага пав.; у смаленскай губ.—Бальшыя Хізы, Малыя Хізы дарагабускага пав., Хізнае ельнінскага пав.; у чарнігаўскай губ.—Хіжкі хішчанскага сс. канатопскага раёну і акругі і інш. [154]); доленцаў [174])—у назвах рэчак Дольнай б. віленскай губ. і Даленкі правага прытоку Шчары, а таксама ў назвах наступных паселішчаў: у ковенскай губ.—Далінка войткускай вол. вількамірскага пав.; у віленскай губ.—Дольны салечніцкай вол., Дольная падбярэскай вол., Дольны, Доліны, Доліны Доліны, Дольны міцкунскай вол. Доль-

ная быстрыцкай вол. віленскага пав., Даліняны васіліскай вол. Даліна жырмундзкай вол., Даліна каняўскай вол., Даліна лідзкай вол., Даліна Зарэчная рожанкаўскай, Даліна прамая ражанкаўскай вол. лідзкага пав., Даліна, |Даліна дзевеніскай вол. ашмянскага пав., Дольні заблоціскай вол., Дольнікі, Дольнікі камеліскай вол., Даліна лынгмянскай вол. сьвянцянскага пав.; у менскай губ.—Доліцы глівінскай вол., Дольцы Малыя, Дольцы Малыя, Дольцы, Дольцы Вялікія вялікадолецкай вол. барысаўскага пав., Дольск любешэўскай вол. пінскага пав., Дольная шчорсаўскай вол. наваградзкага пав., Даліна новадароскай вол. бабруйскага пав., Даліна бродніцкай вол. пінскага пав.; у горадзенскай губ.—Долкі ружанскай вол. слонімскага пав., Дольная новабярозаўскай вол. бельскага пав.; у сувалкскай губ.—Далінчаны аўгустоўскага пав., Дольніца, Дольніца кальварыйскага пав. і інш. [154]); дашан—у назьве рэчкі Дакшнянкі б. віленскай губ. і ў назвах паселішчаў: у менскай губ.—Дошнава чапліцкай вол., Дошнава цімкавіцкай вол., слуцкага пав.; у ковенскай губ.—Даўчані сярэдніцкай вол., Дашканты кейданскай вол. ковенскага пав.; у віленскай губ.—Дашкуны, Дашны, Дашны рудамінскай вол. віленскага пав., Докшыцы, Докшыцы парпліцкай вол., Дакшнянка, Дакшняны радашковіцкай вол., Даўшаны княгінінскай вол. вілейскага пав.; у менскай губ.—Докшыцы [174]); у сувалскай губ.—Дакшнянка, Дакшнэ, Дакшнэ сувалскага пав. і інш. [154]). Назву лекусічаў нагадвае р. Ліксна, прыток Дзьвіны, хутар Ліксна-ж на ёй пры ўпадзеньні ў Дзьвіну і в. Лексты б. Былоўскай вол. б. люцінскага пав. б. віцебскай губ., грозьвінян—м. Грозава, х. Грозаў і х. Гразавок б. грозаўскай вол. б. слуцкага пав. б. менскай губ., гавалян—р. Гаўя б. ашмянскага пав. б. віленскай губ. і паселішчы: Гаўлі недоўскай вол. рагачэўскага пав. магілеўскай губ., Гаўя ліпніцкай вол. ашмянскага пав. віленскай губ.; Гаўляны ворненскай вол. тальшэўскага пав. ковенскай губ., і інш. [154]); справанаў—х. Спаруны, в. Спаруны б. ёдзкай вол. б. дзісьненскага пав. б. віленскай губ. і в. Спараны б. прэльскай вол. б. дзьвінскага пав. і в. Спараны б. Старнянскай вол. б. рэжыцкага пав. б. віцебскай губ. [175]).

Такім чынам сконцэнтраванасьць назваў курганаў, вазёр, рэк, урочышчаў, паселішчаў і інш. географічных об'ектаў, таксама прозьвішчаў, іменьняў і мянушак людзей, што адлюстроўваюць пережыткі народных і племянных назваў народу волатаў могуць сьведчыць аб калішнім пражываньні яго на тэрыторыях паміж Немнам, Дзьвіной, Дняпром і Прыпяцьцю і расьсяленьні, быць можа, уласна адсюль на захад і ўсход, а не з-пад Одры, бо прыведзеныя Шафарыкам і Забеліным падобныя назвы з іншых мясцовасьцяй [176]) могуць, мабыць, сьведчыць толькі аб калёнізацыйным руху волатаў у розныя бакі адсюль, як слушна заўважываў і Весялоўскі [111]).

3.

Але шмат якія дасьледчыкі, угрунтоўваючы свае довады аб старажытных паселішчах волатаў паміж Дзьвіной, Дняпром, Прыпяцьцю і Нёманам спасылкамі на пережыткі іх назваў у назвах географічных об'ектаў і людзей, падкрэсьлівалі, што аб гэтым сьведчаць і гістарычныя і мітолёгічныя паданьні [177]). У сувязі з апошнімі ставілі і казкі аб ваўкалаках, зьвязваючы іх пахаджэньне з названай стараной. Прынамсі так лічыў Шафарык [178]), Шпілеўскі [179]), Буслаеў [180]) і інш. Але на першым месцы, зразумела, павінна быць улічана наяўнасьць паданьняў уласна аб волатах ды асілках, якія зьместам свае назвы, як убачым ніжэй, мала чым адрозьніваюцца ад саміх волатаў.

Паданьні, казкі і легенды пра волатаў ёсьць у наступных паселішчах і іх ваколіцах: I аршанская акруга: а) амсьціслаўскі раён: 1) Бабынічы

татаршчынскага сс.; 2) Амсьціслаў; б) дрыбінскі раён: 3) Крукаўшчына гарадзецкага сс.; в) круглянскі раён: 4) Ахімкавічы I каменіцкага сс.; г) ляднянскі раён: 5) Іскозы іскаскага сс.; д) расьнянскі раён: 6) Прыбярэж забалацкага сс.; е) талачынскі раён: 7) Варанцэвічы воўкавіцкага сс.; ж) чарэйскі раён: 8) Асечана, заборскага сс.; 9) Парніўка гілянскага сс.; 10) Беляны заборскага сс.; 11) Лютыя абчускага сс.; II бабруйская акруга: а) асіпавіцкі раён: 12) Буда лапіцкага сс., 13) Старонка карытнянскага сс.; б) бабруйскі раён: 14) Брожка-Таканаўка каменскага сс.; 15) Раксалянка сычкаўскага сс.; 16) Такары сычкаўскага сс.; 17) Пацава слабада казуліцкага сс.; 18) Маліньнік падрэцкага сс.; в) глускі раён: 19) Гарадок гарадкоўскага сс.; 20) Горнае I, сіманавіцкага сс.; г) клічаўскі раён: 21) Закуцьце наталаўскага сс.; д) парыцкі раён: 22) Хухалеўшчына крукаўскага лясьніцтва, 23) Дабравольшчына дабравольскага сс.; е) рагачэўскі раён: 24) Ліскі пабалаўскага сс.; ж) слуцкі раён: 25) Сярагі сяраскага сс. 26) Цараўцы цараўскага сс.; 27) Дарасіно дарасінскага сс.; 28) Панічы, дарасінскага сс.; 29) Кляпчаны цараўскага сс.; з) старобінскі раён: 30) Задражава мазурскага сс.; 31) Падоблачня старобінскага сс.; 32) Крывічы чырвонадворскага сс.; 33) Чыжэвічы чыжэвіцкага сс.; 34) Мяцявічы мяцявіцкага сс.; 35) Зажэвічы зажэвіцкага сс.; 36) Сяльцо мяцявіцкага сс.; 37) Цясоў пагосцкага сс.; 38) Пагост пагосцкага сс.; 39) Пагост пагосцкага; і) чырвона-слабодзкі раён: 40) Малышавічы малышавіцкага сс.; III віцебская акруга: а) азярышчанскі раён: 41) Будніца хвашнянскага сс,;




Карта раёнаў, у якіх экспэдыцыяй і анкетай 1928 г. засьведчана бытаваньне казак пра волатаў.

